Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

СУБОТА 13 ЖНІЎНЯ 1932 г.
№ 178 (3557)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара . 4-78
Сэктараў 6-15
Начны рэдактар . 12-86 (два званкі)
Выдавецтва . . . 2-44

УСЫПОДПІСКІ
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца ўключна ня позьней 1 лістапада.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 з кадпункт 1 руб

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб згубе 1 дакумэнту—2р.

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ—ПЕРАДАВЫ: Барацьба са стратамі асноўнае ў збожжазагатоўках.

НЕЙГАУЗЭН: Сельска-гаспадарчую навуку на палі саўгасаў і калгасаў (2-я і 3-я стар.).

УДАРНІКАЎ ДРУКУ—У ПЕРАДАВУЮ КАЛЕНУ БАРАЦЬБЫ ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЎРАДЖАЙ (1-ая ст.)

Аб разьмеркаваньні дэходаў і ўраджаю ў калгасах у 1932 годзе. Пастанова Калегіі НКЗ і праўленьня Калгасцэнтру БССР 2-я стар.).

За 1500.000 тон торфаздабычы (3-ая стар.).

Па сьлядох рабселькораўскіх допісаў. (3-ая тора.).

Усебеларускі конкурс на лепшую падрыхтоўку да навучальнага году. (3-я стар).

Пераключыць усю сілу, усю энэргію гораду на аказаньне сацыялістычнай дапамогі вёсцы. (4-ая стар).

Дамо 10.000 тон збожжа ў жніўні (1-ая стар.).

«Людзі, якія робяць замахі на грамадзкую уласнасьць павінны разглядацца, як ворагі народу» (З пастановы ЦВК і СНК СССР). (1-ая стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ. (4-ая стар.).

БАРАЦЬБА СА СТРАТАМІ—АСНОЎНАЕ Ў ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ

Сьледам за паўднёвымі раёнамі Саюзу, збожжазагатоўкі пачаліся і ў БССР. Калгасны сэктар, атрымаўшы буйныя перамогі ў час сяўбы і ўборкі, зрабіў пачын і ў збожжазагатоўках. Да загатоўчых пунктаў рушыліся першыя чырвоныя абозы новага збожжабальшавіцкага ўраджаю.

Аднак, першыя весткі аб ходзе загатовак за пяцідзённу жніўня красамоўна гавораць аб тым, што справе збожжазагатовак не надаюць на мясцох таго значэньня, якога яны заслугоўваюць. На 5-га жніўня па няпоўных вестках загатоўлена па БССР каля 350 тон збожжа. Гэта складае нічэмны процант да пляну ў 10 тыс. тон.

Прычына невыкананьня пляну ў першыя дні загатовак хаваецца ў слабой пастаноўцы масавай работы саветаў, у наяўнасьці шкоднай, наскрозь апартуністычнай, думкі, што «з загатоўкамі пасьпеем, важней убраць збожжа бяз страт». Другой прычынай трэба лічыць абсалютную няўвагу да загатовак у аднаасобным сэктары і адсутнасьць кантролю над выкананьнем кулацка-заможнымі элемэнтамі вёскі цьвёрдых заданьняў.

Такое становішча далей абсалютна нецярпіма. Ня гледзячы на тое, што плян збожжазагатовак значна зьменшаны для Беларусі, усё-ж яго выкананьне патрабуе вялікага напружаньня сіл. Дзяржаўная загатоўка збожжа мае свае цьвёрдыя каляндарныя тэрміны і задавальненьне патрэб дзяржавы ўжо ў першыя дэкады зьяўляецца важнай гаспадарча-палітычнай задачай.

Перамога сацыялістычнага сэктару вёскі выклікала жорсткае супраціўленьне клясавага ворага. Цяпер, калі на калгасных палёх ідзе масавая ўборка ўраджаю, кулак і шкодніК абралі сваёй мішэнэй найважнейшыя моманты ўборкі. Разлаваны, страціўшы грунт пад нагамі, вораг саветаў зрывае асноўнае ў посьпехах уборачнай—барацьбу са стратамі. У збожжазагатоўках гэтага году манэўры клясавага ворага набылі новыя формы і новую афарбоўку. Ня бачыць і не разумець гэтай варожай тактыкі—значыць нічога не разумець у палітычных асаблівасьцях моманту, у характары клясавай барацьбы.

Асноўнае і рашаючае ў збожжазагатоўках—гэта барацьба са стратамі, жорсткі адпор клясаваму ворагу, чоткая арганізацыя загатовак на ўсіх этапах.

Барацьба са стратамі пры ўборцы—першая папярэдняя ўмова посьпеху барацьбы са стратамі пры загатоўках. Партыйныя арганізацыі на мясцох і саветы, арганізоўваючы масы, павінны накіраваць увесь удар у першую чаргу на сваячасовую касьбу ва ўпчыльненыя тэрміны, на скіртаваньне, абмалот і безадкладную здачу (продаж) належачага дзяржаве збожжа. Чым лепш пастаўлена барацьба за кожны сноп, за кожны колас, тым больш хлеба ў калгасе, тым лягчэй выканаць плян продажу хлеба дзяржаве. Вось вакол чаго павінна разгортвацца партыйна-масавая агітацыя, за што павінны змагацца саветы.

Аднак, было-б няправільным зводзіць увесь сэнс перамог у збожжазагатоўках выключна да пэўных тэхніка-вытворчых мерапрыемстваў (зерняўлавіцелі, скіртаваньне, старанная касьба і г. д.). Барацьба са стратамі ў збожжы мае свае палітычныя моманты. Мы маем на ўвазе цэлы рад адмоўных зьявішч, якія выявіліся ўжо ў першую дэкаду збожжазагатовак. У «Савецкай Беларусі» ўжо пісалася аб тым, што загатоўчыя органы і райкалгасаюзы павінны загадзя намеціць пляны збожжазагатовак па калгасах. Між тым, гэтай работы ў радзе раёнаў яшчэ не пачыналі. Тут маем магчымасьці паўтарэньня леташніх памылак, калі да калгасаў падыходзілі з агульнай шаблённай меркай і ўстанаўлялі плян «на-вока». З гэтай ураўнілаўкай нічога агульнага ня маючай з палітыкай партыі ў калгасным будаўніцтве, трэба па весьці самую рашучую барацьбу. Пляновасьць збожжазагатоўкі,--гэта значыць загадзя, цяпер-жа, вызначыць рэзультаты ўборкі, патрэбы калгасу і яго асаблівасьці. Прычым унутрыкалгаснае плянаваньне ні ў якім разе ня можа ісьці па шляху складаньня балянсаў да таго часу, пакуль ня выкананы дзяржаўны плян загатовак. Неабходна абавязкова ўлічыць тыя ільготы, якія прадстаўлены дакаму калгасу згодна закону. Апошні момант мае вялікае палітычнае значэньне і ўвесь сэнс гэтай работы па ільготах ў тым, каб калгасьнікі моцна ведалі, што ільготы—гэта заахвочваньне да новых асвоеньняў масываў зямлі, да пашырэньня пасеву тэхкультур, да разгортваньня калгаснага гандлю. Іменна цяпер час для рэалізацыі ўрадавага закону аб ільготах.

Пры ўстанаўленьні плянаў для асобных калгасаў трэба выходзіць з дзьвюх задач: барацьбы з апартуністычнай страхоўкай, з намаганьнямі зьмяншаць пляны—з аднаго боку і з другога—з няўважлівымі адносінамі да сапраўднага становішча калгасу. Саветы, зямельныя органы, загатоўцы павінны папулярызаваць тое палажэньне, што «калгасы, якія лепш пасеялі, убралі і акуратна выканалі ўстаноўленыя для іх плян дзяржаўных загатовак, мелі-б адпаведна ў сваім распараджэньні для ўласных патрэб большую колькасьць хлеба».

Вялікай небясьпекай для пасьпяховага ходу збожжазагатовак зьяўляецца спэкуляцыя збожжам. Спэкулянт, перакупшчык—вораг збожжазагатовак. Заўчасны да 15 студзеня гандаль збожжам, калі агульна-дзяржаўны плян загатовак яшчэ ня выкананы,—самае сур'ёзнае злачынства. Гэта разбазраваньне збожжа, якое мяжуецца з расспратай народнае маемасьці.

Шкоднікі і кулацкія элемэнты страты збожжа арганізоўваюць і па другіх кірунках. Зусім чотка выявілася разбазраваньне збожжа пры выдачы авансаў, калі ўжываўся прынцып ураўнілаўкі. Збожжа выдаюць з усяго першага абмалоту бяз уліку і запісаў. Месцамі гэта робіцца проста на полі. Пры арганізацыі грамадзкага харчаваньня былі выпадкі неабмежаванай выдачы збожжа бяз улічэньня колькасьці і якасьці працы калгасьніка.

Пры дрэнным пастаноўцы ўліку, пры дрэнным плянаваньні, пры дрэнным ходзе абмалоту ствараецца глеба для праяўленьня буржуазных месьніцкіх тэндэнцый. Ад гэтага кароткі шлях і да лібэральных, а месцамі злачынных, апяхунскіх адносін да крадзяжу збожжа. На гэтым вучастку клясавай барацьбы трэба мабілізаваць сілы на бязумоўнае выкананьне рашэньня ЦВК і СНК СССР аб ахове грамадзкай маемасьці. Кулакам, антыграмадзкім элемэнтам, хуліганам, злодзеям і гультаём, якія гатовы жыць на чужых харчох, жадаюць сарваць рэзультаты геройнай працы лепшых ударнікаў—самы бязьлітасны адпор.

Збожжазагатоўкі гэтага году павінны праходзіць пад знакам умацаваньня рэвалюцыйнай законнасьці, пад знакам пільнай аховы маемасьці калгасаў, кааператываў і дзяржавы. «Грамадзкая ўласнасьць (дзяржаўная, калгасная, кааперацыйная) зьяўляецца асновай савецкага ладу, яна сьвяшчэнна і недатыкальна, і людзі, якія кваплцца на грамадзкую маемасьць павінны разглядацца, як ворагі народу».

Збожжазагатоўкі пачаліся, але ня прыведзены ў дзеяньне ўсе падаважнікі вялікага загатоўчага апарату. На мясцох па раёнах БССР не ўкамплектаваны поўнасьцю загатоўчы апарат, не ўрэгулявана пытаньне з рамонтам і выяўленьнем тары, ня ўлічаны усе транспартныя магчымасьці. Гэтыя і другія арганізацыйныя пытаньні, якія забясьпечваюць правядзеньне важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы—павінны быць вырашаны зараз-жа, бяз усякага адкладаньня.

Перад сельскімі саветамі пастаўлена буйная палітычная задача—арганізаваць загатоўкі. Гэта значыць, што пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, вядучы барацьбу са стратамі, буржуазнымі тэндэнцыямі, з крадзяжом—трэба мабілізаваць калгасныя масы на сваячасовае выкананьне ўсяго загатоўчага пляну.

Поўнасьцю выканаем агульна-дзяржаўны плян загатовак да 15 студзеня. Разгорнем калгасны гандаль збожжам.

„Людзі, якія робяць замахі на грамадзкую уласнасьць, павінны разглядацца як ворагі народу“

(З пастановы ЦВК і СНК СССР)

УСЕ СІЛЫ НА АХОВУ ГРАМАДЗКАЙ (САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ) МАЕМАСЬЦІ

Пастанова ЦВК і СНК СССР «аб ахове маемасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўзмацненьні грамадзкай (сацыялістычнай) уласнасьці», як і ўсе законы савецкай улады накіравана ўсім сваім вастрыём супроць аджываючых, але яшчэ жорстка супраціўляючыхся клясавых ворагаў. Гэты закон накіраваны на ахову кроўных інтарэсаў пралетарыяту і калгасьнікаў, на ўзмацненьне дыктатуры пралетарыяту, на паскораньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Пастанова ўраду абавязвае павесьці рашучую барацьбу з кулацка-капіталістычнымі элемэнтамі, якія імкнуцца ўжываць гвалты і пагрозы, каб прымусіць калгасьнікаў выйсьці з калгасаў, каб гвалтоўна разбурыць калгас. Гэтыя злачынствы прыраўнены да дзяржаўных злачынстваў.

Крадзеж маемасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, маемасьці калгасаў і кааперацыі, злачынныя дзеяньні накіраваныя на разбурэньне калгасаў—гэта імкненьне нашых ворагаў затрымаць наша пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва. Аднак, паасобныя арганізацыі, хварэючы на апартуністычную блізарукасьць, недаацэньваюць усёй вострасьці гэтага пытаньня.

Цэлы рад фактаў крадзяжу дзяржаўнай і калгаснай маемасьці ў прыватнасьці факты крадзяжу са складаў харчовых тавараў адказнымі працаўнікамі цэнтральных устаноў г. Менску, і цяпер такі факт, як пакража з калгаснай фэрмы імя тав. Гея (Асіпавічы) быка і наогул беспакаранае раз базарваньне калгаснай маемасьці з усёй яскравасьцю гаворыць аб прытупленьні клясавай пільнасьці з боку адпаведных арганізацый і лібэральных адносінах органаў пракуратуры да такіх спраў.

З вялікім уздымам сустрэлі калгасьнікі пастанову ЦВК і СНК СССР. У адказ на гэтую пастанову калгасьнікі раду раёнаў датэрмінова выконваюць пляны збожжазагатовак, арганізуюць агульна-раённыя чырвоныя абозы.

Зараз па ўсёй Беларусі праводзіцца агляд работы вучасткаў нарсуду, абвешчаны конкурс на лепшы вучастак і нарсудзьдзю. Справа гонару кожнага працаўніка судовых вучасткаў змагацца за пасьпяховае выкананьне пастановы аб ахове маемасьці, што цяпер нейшым чынам зьвязана з рашэньнем аб рэвалюцыйнай законнасьці.

Працаўнікі судовых вучасткаў павінны памятаць, «што грамадзкая ўласнасьць (дзяржаўная, калгасная, кааперацыйная) зьяўляецца асновай грамадзкага ладу, яна сьвяшчэнна і недатыкальна. Людзі, якія робяць замахі на грамадзкую ўласнасьць, павінны разглядацца, як ворагі народу, з прычыны чаго рашучая барацьба са зладзеямі, якія раскрадаюць грамадзкую маемасьць, зьяўляецца найпершым абавязкам органаў савецкай улады». (З пастановы ЦВК і СНК СССР).

Ад усіх партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый зараз-жа патрабуецца правядзеньне шырокай растлумачальнай работы вакол пастановы ўраду. Мабілізуючы пралетарскую і калгасную грамадзкасьць, трэба дамагчыся ў штодзённым ужытку поўнага ажыцьцяўленьня гэтай пастановы.

ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ ЗА КРАДЗЕЖ КАЛГАСНАЙ МАЕМАСЬЦІ

У калгасе імя Гея (аддзяленьне № 3), Лапіцкага сельсавету, Асіпавіцкага раёну, Жаковіч Міхась уночы з 16 на 17 чэрвеня г. г. украў з малочнай калгаснай фэрмы быка, зарэзаў яго, частку прадаў, а частку скарыстаў сам.

Жаковіч, будучы раней старшынёй калгасу, разбазарыў шмат калгаснай маемасьці, за што быў адданы пад суд. Але чамусьці нашы мясцовыя судзьдзі давялі справу да таго, што Жаковіч застаўся на волі.

Зараз Жаковіч, знаходзячыся ў калгасе, беспакаранна вядзе разбуральную работу сярод калгасьнікаў. Уся яго «палітыка» накіравана на развал работы калгасу.

Сьледчыя органы Асіпавіцкага раёну, якім перадана справа аб дзеяньнях Жаковіча, справу гэту марынуюць у сваіх папках.

Да Жаковічаў павінны быць ужыты самыя жорсткія і безадкладныя меры, як гэтага патрабуюць апошнія пастановы ўраду аб ахове маемасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі.

Бурдык.

Калгасы вітаюць пастанову ўраду

ЖЛОБІН. 8-га жніўня райнарада старшынь калгасаў з вялікім здавальненьнем заслухала паведамленьне аб пастанове ўраду па пытаньні аховы калгаснай маемасьці.

Бурнымі воплескамі была спаткана гэтая пастанова старшынямі калгасаў. У адказ на мерапрыемствы ўраду райнарада старшынь калгасаў парашыла: плян збожжазагатовак 1932 г. выканаць поўнасьцю і датэрмінова да 25 жніўня 1932 г.

14-га жніўня арганізаваць агульна-раённы чырвоны абоз са збожжам, сенам, саломай і мясам.

Закрэўскі.

Злачынцаў да адказнасьці

Разбазарваньне і крадзеж збожжа і розных прадуктаў з боку паасобных работнікаў за апошні час прынялі буйны характар.

Група адказных работнікаў з Лесбелу, Белсьвінаводтрэсту, Клінічнага гарадка, Белдрэва, Белдзяржбуду па ўзаемнай згодзе з прыватнымі асобамі, карыстаючыся доступам у склады, раскралі за апошні час 11.250 кг. аўсу, 10.000 кг. кукурузы, 1.960 кг. розных кармоў, 450 кг. пшанічнай мукі і 18 тон аўсу. Вось яны, гэтыя злачынцы:

Гр-н Лінчэўскі, зьяўляючыся адказным выканаўцам Белсьвінаводтрэсту, выдаў агенту забясьпечаньня Навукова-дасьледчага інстытуту сьвінагадоўлі 11.250 кг. аўсу і атрымаў за кожны пуд аўсу па 3 рублі. Апрача таго, Лінчэўскі па выпісаных нарадах атрымаў сам непасрэдна са складу 1.900 кг. розных кармоў і 450 кг. пшанічнай мукі.

Гр-н Зялёнка, зьяўляючыся заг. гаспадаркі Клінічнага гарадка, прымаў удзел у сыстэматычных раскраданьнях маемасьці належачай дзяржаўным установам. Атрымаўшы са студзеня па май месяц 200 пудоў кукурузы, 10.000 кг. аўсу распрадаў іх на прыватным рынку.

Гр-н Вярцінскі, будучы агентам забясьпечаньня саўгасу «Вішнёўка», раскраў 200 пуд. кукурузы, якая знаходзілася на таварнай станцыі Менску і якая належала саўгасу «Вішнёўка». Кукурузу ён прадаў гр-ну Зялёнка.

Гр-н Ільчынскі, зьяўляючыся адказным выканаўцам трэсту Белмукі і маючы права распараджацца мукой, раскрадаў муку, выпісаўшы для Навукова дасьледчага інстытуту сьвінагадоўлі 450 кг. пшанічнай мукі ў той час, калі інстытут ня меў права атрымаць пшанічную муку, і атрыманую муку падзяліў паміж сабою, Лінчэўскім і Драveнікам.

Гр-н Вольха, будучы нам. заг. сэктару забясьпечаньня Лесбелу, які распараджаўся аўсом, выпісаў нарады на атрыманьне аўсу для Белдрэва 4 тоны, для Менскага Леспрамгасу 5 тон, і гэты авёс у колькасьці 9 тон прадаў на прыватным рынку праз агента забясьпечаньня Белдрэва Рудэрмана.

Гр-н Зэндэль, будучы агентам забясьпечаньня Белдзяржбуду, актыўна дапамагаў раскраданьню аўсу належачага Лесбелу, шляхам пакупкі для Белдзяржбуду заведама пакрадзенага Вольхай і Рудэрманам. Авёс быў прададаны гр. Рудзіцкаму. Зэндэль таксама падрабіў рахункі на куплены авёс з мэтай захаваць раскраданьне і атрыманьне ім ад Рудзіцкага 300 руб.

Усе гэтыя злачынцы знаходзяцца пад вартай. Органы дыктатуры пралетарыяту павінны ў адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК даць на руках тым, хто імкнецца перашкодзіць пасьпяховаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Бірштэйн.

Дамо 10.000 тон збожжа ў жніўні!

„Выканаем з гонарам усе віды загатовак“

КРУПКІ. У раёне шырока разгорнута масавая работа ў зьвязку з юбілеем «Зьвязды». Праведзен рэйд праверкі рэалізацыі рашэньняў партыі і ўраду аб ажыцьцяўленьні ленінскай нацпалітыкі і справы прасоўваньня шырспажыву ў вёскі. На нарадзе парт'ячэек разгорнута масавая работа вакол пашырэньня падпіскі на «Зьвязду», за ўзьняцьцё на вышэйшую ступень рабселькораўскага руху і нізавога друку. Халопеніцкі, Хацюкоўскі, Трыськаўскі, Ухвальскі, Крупскі і інш. сельсаветы разгарнулі работу па мабілізацыі мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на арганізацыю чырвоных абозаў са збожжам, сенам і гародніной. Калгас «Чырвоны герой», Крупскага сельсавету, здаў (прадаў) 2,5 тоны жыта, 2 вазы сена і абавязаўся з гонарам выканаць усе віды загатовак. Калгасьнікі калгасу «Чырвоны герой» ўсе ахоплены падпіскай на пазыку «4-ты заключны». Таксама ўнесена ў ліст сельгаспадатку 100 руб. (Белта).

Капцэвіцкі ссыпны пункт не падрыхтаваны да прыёму збожжа

ПЕТРЫКАЎ. Ня гледзячы на тое, што збожжазагатоўчая кампанія распачалася, загатоўчыя пункты яшчэ не падрыхтаваны.

3-га жніўня калгасы Грабаўскага сельсавету прывезьлі дзяржаве жыта на Капцэвіцкі ссыпны пункт. Але з прычыны непаваротлівасьці працаўнікоў складу калгасьнікі чакалі з падводамі з 6 гадзін раніцы да 12 гадзіны дня.

Калгасы Камаровіцкага сельсавету падрыхтаваліся да здачы (продажу) жыта яшчэ 28 ліпеня, але з прычыны непадрыхтаванасьці загатоўчага пункту здалі яго толькі 6-га жніўня. Такія факты назіраюцца яшчэ ў Капаткевічах, Петрыкаве і г. д.

Неабходна рашуча ўдарыць па работніках райзагатэрніна, каб ня зрывалі справу збожжазагатовак.

А. Пілінскі.

Чырвоныя абозы з хлебам

АСІПАВІЧЫ. Рад калгасаў раёну пасьпяхова і поўнасьцю скончылі ўборку і разгарнулі малацьбу збожжа.

9 калгасаў Карытнянскага сельсавету («Чырвоны сьцяг», «КіМ», «Перамога», «Чырвоны май» і інш.) наладзілі чырвоныя абозы і здалі (прадалі) дзяржаве 2020 кілё збожжа і шмат сена. Калгас «Расьсьвет», Заяўцкага сельсавету, чырвоным абозам здаў (прадаў) 460 цнт. збожжа, 2 цнт. мяса і 450 цнт. гародніны.

А. Перагуд.

У адзнаку 15-годзьдзя „Зьвязды“

ПЕТРЫКАЎ. Петрыкаўскі раён уключыўся ў дэкадзік барацьбы са стратамі. У адзнаку юбілею «ЗЬВЯЗДЫ» калгасы Капаткевіцкага сельсавету здалі (прадалі) дзяржаве 22 цнт збожжа, 16 цнт. мяса, датэрмінова ўнесьлі 700 рублёў падатку.

Калгас «Х ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ», Камаровіцкага сельсавету, здаў (прадаў) 32 цнт. жыта, калгас «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ»—90 цнт. жыта.

А. П.

Ідуць абозы

ЗАСЛАЎЕ. Працоўныя Заслаўшчыны сустракаюць 15-годзьдзе «Зьвязды» чырвонымі абозамі і скančэньнем уборкі сена і жыта. Калгас «Чырвоны прамень» здаў (прадаў) дзяржаве 100 пудоў ячменю новага ўраджаю. Калгас «КіМ» і калгас імя Розы Люксэмбург здалі (прадалі) па 150 пудоў жыта і па 200 пудоў саломы. (Белта).

Калгас „Бальшавік“ перавыканаў свой плян

ЕЛЬСК. (Наш кар.). Калгасьнікі Маяравіцкага, Батуліцкага, Санкоўскага, Засінцоўскага і Каменскага сельсаветаў 9-га і 10-га жніўня здалі (прадалі) дзяржаве 3716 кг. збожжа, 6550 кг. сена і 2310 кг. саломы. Аднаасобнікі, беднякі і сераднякі, здалі (прадалі) дзяржаве 450 кг. рэчнага ўкосу сена. Калгас «Бальшавік», Рэмязоўскага сельсавету, перавыканаў свае пляны загатовак—замест 816 кг. паводле пляну, здаў 862 кг. збожжа і выклікаў усе калгасы ўзяць з яго прыклад.

Герасіменка.

Замарожваюць тавары шырспажыву

На Бабруйскай швэйнай фабрыцы дагэтуль ляжыць рознай гатовай прадукцыі больш чым на 5000 руб. На заводзе імя Сталіна таксама ляжыць нерэалізаваная прадукцыя на суму звыш 1000 руб. тут ёсьць такія рэчы, як 600 качэргаў, 200 вілак і 250 капалік.

На заводзе імя Варашылава знаходзіцца каля 2000 гатовых шын для колаў і іншых тавараў шырспажыву на суму каля 5000 руб.

Але ж аб хутчэйшым прасоўваньні гэтых рэчаў да спажыўца ніхто не клапоціцца. З такой работай па выкананьні рашэньняў партыі аб савецкім гандлю трэба рашуча скончыць.

В.

УДАРНІКАЎ ДРУКУ-У ПЕРАДАВУЮ КАЛЕНУ

барацьбы за сацыялістычны ўраджай

НЕ ЦЯГНУЦЦА У ХВАСЬЦЕ УБОРАЧНАЙ, а ІСЬЦІ НА ЧАЛЕ МАС, РАЗАМ З МАСАМІ

(Са старонак раённага друку).

Усесаюзны рэйд ударнікаў друку па барацьбе са стратамі, які абвешчаны «Правдой», завастрыў увагу ўсяго цэнтральнага і нізавога друку. Рад раённых газэт БССР, а за імі саўгасна-калгасныя шматтыражкі і штодзённікі, мабілізуючы ўдарнікаў, па-баявому вядуць паход супроць страт, упарта змагаюцца за сацыялістычны ўраджай.

Аднак, побач з гэтым мы прымушаны адзначыць той факт, што ў радзе месц раённы друк у гэтай справе, у справе разгортваньня рэйду правяў і праяўляе недапушчальную непаваротлівасьць. Некаторыя раённыя газэты абмежаваліся адным толькі зьмяшчэньнем матар'ялаў інфармацыйнага парадку аб абвяшчэньні рэйду і на гэтым паставілі кропку.

Зьвернемся да фактаў, зробім «экскурсію» на старонкі некаторых раённых газэт.

***

«Ленінскі Прызыў» (Аршанская раённая газэта)—выходзіць штодзенна. Бярэм нумар газэты за 5 жніўня. Газэта нібыта выступае з цэлай паласой, прысьвечанай рэйду, з такім аншлягам: «Аршаншчына ўключаецца ў рэйд ударных брыгад друку імя 15-годзьдзя «Зьвязды». Які зьмест гэтай паласы? Дзьве пастановы ЦК КП(б)Б (пастанова аб усесаюзным рэйдзе і пастанова аб 15-годзьдзі «Зьвязды») і пастанова Бюро РК КП(б)Б па тых-жа пытаньнях. Вось і ўвесь зьмест паласы. Аб практычным ажыцьцяўленьні гэтых важнейшых дакумантаў рэдакцыя выступіць не адважылася, а палічыла за лепшае абмежавацца адным толькі іх зьмяшчэньнем. І гэта не выпадкова, бо:

у чарговым нумары—за 6 жніўня аб рэйдзе на старонках газэты—ні слова;

за 7 жніўня—ні слова;

за 8—10 жніўня аб усесаюзным рэйдзе ўдарнікаў друку па барацьбе са стратамі на старонках газэты—нічога ня відаць.

Няўжо-ж Аршаншчына ўсё яшчэ толькі «ўключаецца ў рэйд ударных брыгад друку?». Пара, даўно пара паказаць чытачу, што на самой справе зроблена і робіцца практычнага ў раёне па разгортваньні рэйду, і, у першую чаргу, паказаць, што робіцца раённым друкам.

***

«Калгасьнік Мазыршчыны». Ня гледзячы на тое, што Мазырскі раён амаль ня зыходзіць з чорнай дошкі са старонак цэнтральнага друку за адставаньне па сенаўборцы—«Калгасьнік Мазыршчыны» поліччу патрэбным ня ўключыцца за ўсесаюзны рэйд ударнікаў друку. 8-га жніўня газэта абмяжоўваецца адным толькі перадрукам пастановы ЦК КП(б)Б аб рэйдзе. Аб ігнараваньні ўсесаюзнага рэйду ўдарнікаў друку газэта яшчэ давяла 1 тым, што, зьмясьціўшы пастанову ЦК КП(б)Б, у перадавым да падборкі аб ходзе ўборкі ў раёне, газэта ні слова не гаворыць ні аб рэйдзе, ні аб пастанове партыі.

Так вядзе барацьбу са стратамі «Калгасьнік Мазыршчыны». Між тым, на старонках газэты рабселькоры апавядаюць аб абуральных фактах нядбайных адносін да ўборкі, аб крадзяжы ўраджаю. Так, у калгасе «Дзень ураджаю» заможнікі арганізавалі пакражу снапоў на полі, штодня цягаюць з поля калгаснае збожжа.

Газэта «Калгасьнік Мазыршчыны» павінна сур'ёзна падумаць аб перабудове сваёй работы.

***

Праглядаючы камплекты раду газэт з 3-га па 8-га жніўня відаць, што зусім ня ўключыліся ў рэйд і нічога ня робяць да гэтага часу наступныя газэты: **«Калгасная праўда»** (Лепельскі раён—№ газэты за 5-га жніўня), **«Ленінскі Шлях»** (Сіроцінскі раён—№ газэты за 6 жніўня), **«Калгасная праўда»** (Асіпавіцкі раён—№ газэты за 7 жніўня), **«Маяк камуны»** (Быхаўскі раён—№ газэты за 6 жніўня).

***

Друк БССР, які паказаў бальшавіцкія прыклады барацьбы за ўраджай на справе конкурсу «Правды» у часе веснавой сяўбы, можа і павінен ісьці ў перадавой калёне ўсесаюзнага рэйду па барацьбе са стратамі.

Па прыкладзе раду перадавых адзначаныя вышэй газэты павінны неадкладна пераключыцца на баявое кіраўніцтва рэйдам, мабілізаваць ударнікаў друку на барацьбу за сацыялістычны ўраджай.

Не цягнуцца ў хвасьце, а ісьці на чале мас, разам з масамі—у гэтым задача рэйду.

Ня толькі тэмпы, нам патрэбна якасьць работы, барацьба са стратамі

(РЭЙД УДАРНІКАЎ ДРУКУ)

Праведзены рэйд ударнікаў друку штодзённі саўгасу «Вэйна» сумесна з рабочымі саўгасу дае магчымасьць падвесьці некаторыя вынікі выканаў ня сельска-гаспадарчых работ у гэтай гаспадарцы.

Паводле вытворчага пляну, саўгас пачаў уборку жыта 26 ліпеня, скончыў уборку за 11 дзён—да 5 жніўня. На чатырох жняярках брыгады Анцыпенка і Якаўлева — самаскідках і 2 снапавязалках ажалі 243 га жыта і 55 га ячменю.

У першыя дні работы ўборка праводзілася марудна. Гэта залежала ад невыкананьня норм зьдзельшчыны, частых паломак, дрэннае якасьці работы. Але ўсё гэта было пераможана. Дзякуючы разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва, правільнаму кіраўніцтву партячэйкі, якая на ходу выправіла дапушчаныя памылкі, рабочыя дамагліся рашучага пералому ў тэмпах работы. Замест нормы у 3 га, якая ў першыя дні ня выконвалася, на чацьверты дзень уборачных работ жняяркі-самаскідкі зжынулі і па 4 га і снапавязалкі па 5 га. Гэтаму дапамагла сваячасовая выдача нарадаў на работы, правільная расстаноўка сіл унутры брыгад.

27 ліпеня сагучаса было зжата 18 га збожжа, 28 ліпеня—26 га, 31-га—27 га і 2 жніўня—34 га. Такім чынам з кожным днём тэмпы ўборкі няспынна ўзрасталі. З посьпехам выконвалі свае заданьні жанчыны. Норму ў 1 га для вязкі снапоў для 4 жанчын з посьпехам выконвалі 3 жанчыны.

У саўгасе ёсьць 23 камсамольцы, з якіх 11 заняты на сьвінарніку, а 12—непасрэдна ў брыгадах на полі. Камсамольская арганізацыя саўгасу пабальшавіцку змагалася за ўшчыльненьне тэрміну уборкі. Па яе ініцыятыве ў час уборкі выходзілі на работу ў выходныя дні, работа пачыналася а 6 гадзіне раніцы і праводзілася да цямна. Камсамольская арганізацыя разгарнула ўпартую барацьбу са стратамі. Па ініцыятыве камсамольцаў было арганізавана падграбаньне каласоў. Камсамольцы: **Арманенка Даша, Пячора Юля і Баер Ю.** штодзённа перавыконвалі норму выпрацоўкі на 30 проц. па вязцы снапоў. У арганізаваным сацспаборніцтве паміж брыгадамі тт. Анцыпенка і Якаўлева ўзулі пяршынства ў рабоце. **Крукоўскі, Лаўрэнаў, Анцыпенка, Валуеў, Новікаў, Усаенка, Падольскі, Бандзелікова, Цывіна і Менгенавіч.**

Дырэкцыя вызначыла 1000 рублёў для прэм'яваньня лепшых ударнікаў. Прэміі будуць разьмяркоўвацца па сканчэньні ўборкі аўсу.

Скончыўшы ўборку жыта і ячменю, саўгас адразу пераключыўся на малацьбу. Трыкутнік саўгасу здолеў ма білізаваць увагу рабочых на ўзьняцьце тэмпаў, выклікаў актыўнасьць мас, узмацніў працдысцыпліну, ліквідаваў прагулы і спазьненьні. Па ініцыятыве рабочых уведзены кругласутачны абмалот. Ударнасьць работы лепш за ўсё характарызуецца лічбамі выкананьня работ. У першы дзень было намалочана 16 га ўраджаю, на другі дзень—19 га, на трэці—20 га, зараз штодзённа абмалочваецца ўраджай з 24 га. На 7 жніўня дзьвюма паўскладнымі малатарнямі пры 78 рабочых абмалочана 165 га жыта ці 67,8 проц. пляну, і 15 га ячменю ці 27 проц. пляну. Астатняе жыта складзена ў тарпы.

Але ўзяўшы тэмпы кіраўніцтва саўгасам не зьвярнула належнай увагі на якасьць работы: барацьба са стратамі ў саўгасе яўна ігнаруецца. Пастановы ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб правядзеньні ўборачнай не знайшлі належнага адбітку ў саўгасе «Вэйна». Кіраўніцтва саўгасу недаацаніла гэтай важнейшай задачы. Да гэтага часу ня складзены ў торпы 40 га ячменю. Яшчэ з пачатку ўборкі ў саўгасе наглядалася разьбежка паміж жнівам і ўборкай. Недаацэнка скірдаваньня поўнасьцю выявіла сябе ў час уборкі ячменю. Дырэкцыя саўгасу ссылаецца на «аб'ектыўныя» прычыны, што, ці бач, пасьпеем абмалаціць, пачакаем, покуль абмалоцім жыта і г. д.

Падграбаньне каласоў не праводзіцца. Чаму-ж зацягваецца падграбаньне каласоў? Прапанова аб правядзеньні гэтага мерапрыемства спачатку была падхоплена адміністрацыяй саўгасу, але пасьля забылася аб гэтым мерапрыемстве. Між тым, падграбаньне каласоў дае значны гаспадарчы эфэкт. Зробленае падграбаньне з 3 га дало 9 пудоў саломы з зернямі. З усёй плошчы ў сярэднім можна дадаткова зграбсьці 720 пудоў саломы, што прыблізна можа даць 45—50 пудоў жыта.

Мер барацьбы са стратамі саўгас таксама ня ўжыў і ў час перавозкі збожжа. Фуры высьцілаліся рэдкім пластом саломы, праз які пры перавозцы жыта зерня высыпалася на зямлю.

Пры абмалоце збожжа не зварочваецца належнай увагі на барацьбу са стратамі. У каласох застаецца зерня. Калі брыгада рэйду заявіла дырэкцыі, што трэба больш уважліва адносіцца да малацьбы, дык дырэкцыя саўгасу заявіла, што «паўторна прапускаць салому праз малатар

Аб разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў калгасах у 1932 годзе

Пастанова калегіі НКЗ і праўленьня Калгасцэнтру БССР

Разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ў калгасах у гэтым годзе павінна праводзіцца выключна па колькасьці і якасьці працы, затрачанай калгаснікамі, згодна запісаных у працоўныя кніжкі колгаснікаў працадзён, у поўнай адпаведнасьці з указаньнем VI зьезду Саветаў аб тым, што «той хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае, хто не працуе, той нічога не атрымлівае».

Для таго, каб яшчэ больш павялічыць свае даходы, усе калгасы і калгаснікі павінны ўлічыць у часе ўборачнай кампаніі памылкі і недахопы, якія былі дапушчаны ў мінулым годзе, зрабіць належныя вывады і паставіць перад сабой наступныя задачы:

а) дабіцца поўнага зьнішчэньня страт пры ўборцы і апрацоўцы ўраджаю;

б) максымальна зьнізіць адміністрацыйна-гаспадарчыя і вытворчыя выдаткі, вясьці сыстэматычную барацьбу за эканомнае выдаткаваньне і рацыянальнае скарыстаньне кармоў;

в) скарыстаць усе наяўныя магчымасьці для атрыманьня дадатковых даходаў, шляхам разьвіцьця саматужных промыслаў, адыходных заработкаў і г. д.;

г) найбольш поўна і рацыянальна скарыстаць людзкую і цягавую сілу, шляхам умацаваньня вытворчых калгасных брыгад і правільнай расстаноўкай сілы ўнутры самой брыгады;

д) паставіць правільны ўлік працы і ўсяго ўраджаю.

Пры выкананьні гэтых умоў калгасы значна павысяць даходнасьць сваёй гаспадаркі, забясьпечаць поўнае выкананьне плянаў загатовак, шырока разгорнуць калгасны гандаль прадуктамі сельскай гаспадаркі і саматужнай прамысловасьці, забясьпечаць утварэньне неабходных фондаў накапленьня для расшырэньня калектыўнай гаспадаркі і павялічаць ацэнку працадня і рост даходнасьці калгаснікаў пры разьмеркаваньні даходаў.

Агульны даход калгасаў і яго разьмеркаваньне

1. Агульны даход калгасаў, які падлягае разьмеркаваньню, складаецца з усёй колькасьці атрыманай ад паляводзтва прадукцыі, гародніцтва, садоўніцтва, лугаводзтва, жывёлагадоўлі і іншых галін гаспадаркі, а так сама з грашовых даходаў ад падсобных прамысловых прадпрыемстваў і пабочных заработкаў, Даходы калгаснікаў, атрыманыя на адыходных заработках, у даход колгасу не ўключаюцца.

Кошт прадукцыі ўраджаю 1931 году, якая не ўваходзіла ў разьмеркаваньне даходаў мінулага году (неапрацаваны лён і іншыя) уключаюцца ў даход калгасу за 1932 год.

2. Пры падліку сумы агульнага даходу ў грашовым выражэньні прадукцыя, рэалізаваная па загатоўках і ў парадку калгаснага гандлю, улічваецца па фактычнай выручцы, а прадукцыя, што пакідаецца ў калгасе для патрэб гаспадаркі і падлягае разьмеркаваньню паміж калгаснікамі— па загатоўчых дзяржаўных цэнах. У тым выпадку, калі ў калгасе застаецца прадукцыя, выдзеленая для калгаснага гандлю, кошт яе арыентовачна ўлічваецца па сярэдніх рыначных цэнах данай мясцовасьці.

3. У агульны даход ня ўключаецца кошт прыплоду жывёлы, які пакідаецца ў гаспадарцы для павялічэньня калгаснага статку, кошт прыросту жывёлы, кошт набытых калгасам сродкаў вытворчасьці (рабочая і прадукцыйная жывёла, машыны і інвэнтар), кошт новых пабудоў і капітальнага рамонту.

4. З агульнага даходу калгасу падлягаюць разьмеркаваньню паміж калгаснікамі:

а) харчовыя прадукты — збожжа, бульба, гародніна і іншае, за выключэньнем часткі, якая падлягае здачы (продажу) па загатоўках, насеннага і страхавога фондаў;

б) кармы (збожжа, сілос, сена і іншае), за выключэньнем тых, якія падлягаюць здачы (продажу) дзяржаве, і выдзеленых кармавых фондаў для тварных фэрм, конскага пагалоўя і іншай арамаджанай жывёлы калгасу і недатыкальнага страхавога фонду кармоў;

в) грашовыя даходы калгасу, за выключэньнем завінавачанасьці па крэдытах і абавязацельствах, сельскагаспадарчага падатку, страхоўкі, адлічэньняў у непадзельны фонд і калгасныя касы грамадзкай узаемадапамогі.

5. Пры разьмеркаваньні даходаў 1932 году калгасы абавязаны ўтварыць непадзельны фонд у разьмеры 10—15 проц. ад агульнага даходу, за выключэньнем сельскагаспадарчага падатку, страхоўкі, плацяжоў па крэдытах, якія неабходна аплаціць у 1932 г. і кошту насенных і фуражных фондаў.

6. Грашовыя выдаткі на капітальныя ўкладаньні (будаўніцтва, купля жывёлы, інвэнтару і іншае), якія зроблены на працягу 1932 г. залічваюцца ў кошт адлічэньняў (10—15 проц.) у непадзельны фонд.

Астача сум, адлічаных ў непадзельны фонд, уносіцца на бягучы рахунак калгасу ў Дзяржбанку па капіталаўкладаньнях і выдаткоўваецца ў 1933 г. выключна па прамым прызначэньні.

7. Забараніць утварэньне якіх-небудзь іншых фондаў і адмяніць 3 проц. адлічэньне для разьмеркаваньня па аграмаджанай маёмасьці.

8. Побач з выкананьнем плянаў загатовак ужо ў ходзе абмалоту калгасы павінны выдаць калгаснікам авансы за лік натуральнай часткі даходаў у разьмеры 10—15 проц. фактычна абмалочанага зерняці, прычым разьмеркаваньне збожжа праводзіць выключна па выпрацаваных калгаснікамі працаднёх, пачынаючы з 1 студзеня 1932 г.

9. У тых калгасах, дзе гэта будзе прызнана неабходным самімі калгаснікамі, праводзіць выдачу авансаў, у залік натуральнай часткі даходаў у разьмерах 15—20 проц. тае прадукцыі, якая падлягае разьмеркаваньню паміж калгаснікамі, згодна папярэдняга пляну разьмеркаваньня.

10. Не дапускаць затрымкі ў выдачы грашовай часткі даходу калгаснікам да яго канчатковага разьмеркаваньня, устанавіўшы такі парадак, каб асноўная частка грошай, якія атрымліваюцца калгасам за зданую (праданую) ім прадукцыю выдавалася калгаснікам у парадку авансу па колькасьці выпрацаваных імі працадзён.

Устанаўленьне ацэнкі працадня

1. Для таго, каб зацікавіць кожную брыгаду, кожнага калгасьніка і калгасніцу ў выніках сваёй работы, усе калгасы абавязаны няўхільна выконваць пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 5 ліпеня г.-г. аб тым, што «ў залежнасьці ад якасьці работы брыгады (разьмеры страт, тэрміны ўборкі, абмалот і звозка збожжа і тэхнічных культур), ацэнка кошту працадня (або колькасьць выпрацаваных працадзён) для брыгады і брыгадзіраў павышалася, або паніжалася праўленьнем калгасу ў межах ад 10 да 20 процантаў».

2) Пасьпяховасьць работы брыгады ўстанаўліваецца фактычна сабраным ураджаем з 1 га, атрыманым удоем малака ад каровы, колькасьцю выгадаваных парасят, цялят і іншай жывёлы, а таксама разьмерам усёй продукцыі, якую атрымала брыгада з замацаванага за ёй вытворчага вучастку, таварнай фэрмы і іншых галін гаспадаркі.

Асаблівая ўвага пры ацэнцы пасьпяховасьці работы брыгады павінна быць зьвернута на якасьць работы брыгады, ужываньне агратэхнічных і заатэхнічных мерапрыемстваў, якасьць догляду за жывёлай і сапраўдную барацьбу са стратамі, адыходам жывёлы і іншае.

3. Праўленьне калгасу пры непасрэдным удзеле брыгадзіра абмяркоўвае вынікі работы кожнай паасобнай брыгады і ўстанаўлівае ў залежнасьці ад гэтага ацэнку працадня, або павялічэньне ці зьніжэньне колькасьці працадзён для кожнай брыгады і брыгадзіра.

Вынікі работы брыгад і ўстаноўленая праўленьнем ацэнка працадня, або павялічэньне ці зьніжэньне колькасьці працадзён для брыгады абмяркоўваецца на вытворчых чарадах і канчаткова зацьвярджаюцца агульным сходам калгаснікаў.

4. Для таго, каб устанавіць павялічэньне або паніжэньне ацэнкі працадня для паасобных брыгад і брыгадзіраў, праўленьне калгасу павінна вылічыць сярэдні кошт працадня па калгасе ў цэлым.

Сярэдняя ацэнка працадня па калгасу ў цэлым вызначаецца сумай даходу, які падлягае разьмеркаваньню паміж калгаснікамі, падзеленай на ўсю колькасьць налічаных калгаснікам працадзён за 1932 г.

5. Да вылічэньня сярэдняй ацэнкі працадня па калгасе ў цэлым з сумы даходу, якая падлягае разьмеркаваньню паміж калгаснікамі, вылічваецца сума даходу, якая прыпадае на працадні трактарыстаў, выпрацаваныя імі ў гэтым калгасе на трактарах МТС.

7. Калі праўленьне калгасу ўстанаўлівае брыгадзе павялічэньне ці зьніжэньне асноўнай колькасьці працадзён, выпрацаваных калгаснікамі брыгады на працягу году, гэтыя працадні павінны разьмяркоўвацца ўнутры брыгады паміж паасобнымі калгаснікамі з улікам якасьці работы кожнага калгасьніка, яго ўдзелу ў рабоце ў напружаныя пэрыоды работ (сяўба, праполка і ўборка), захаваньне ў добрым выглядзе прымацаваных да яго коняй і інвэнтару і інш.

Катэгорычна забараніць ураўніцельнае разьмеркаваньне надбаўленай ці зьніжанай колькасьці працадзён брыгадзе, паміж усімі калгаснікамі брыгады.

Разьмеркаваньне натуральнай часткі даходу

Натуральная частка даходаў у калгасах разьмяркоўваецца наступным чынам:

1. У першую чаргу калгас выконвае плян дзяржаўных загатовак па збожжавых, тэхнічных культурах, бульбе, фуражу і іншым відах прадукцыі.

2. Адлічаецца адпаведная колькасьць збожжа для пагашэньня насенных і харчовых пазычак мінулых гадоў у тых калгасах, якія іх атрымлівалі.

3. Выдзяляецца а) насенны фонд для забясьпечаньня засеўных плошчаў, згодна плянаў на асеньнюю сяўбу 1932 г. і веснавую сяўбу 1933 г. з улікам расшырэньня засеўных плошчаў на 10—12 проц., забясьпечыўшы ссыпку лепшага па якасьці насеньня, б) страхавы насенны фонд яравых культур у разьмеры 10—15 проц. насеннага фонду.

4. Выдзяляецца фуражны фонд грубых, канцэнтраваных і сакавітых кармоў для поўнага забясьпечаньня кармамі конскага пагалоўя, таварных калгасных фэрм і іншай арамаджанай жывёлы да новага ўраджаю і ствараецца недатыкальны страхавы фонд кармоў (сена, салома, мякіна) у разьмеры ня менш 15 проц. гадавой патрэбнасьці.

5. Усе астатнія прадукты разьмяркоўваюцца паміж калгаснікамі па колькасьці выпрацаваных імі і запісаных у працоўныя кніжкі працадзён.

Забараніць якое-б там ні было абмежаваньне разьмеру выдачы натуральнай часткі даходу лепшым калгаснікам, якія працуюць на сельскагаспадарчай вытворчасьці і выпрацавалі найбольшую колькасьці працадзён.

6. Рэкамэндаваць калгасам у адносінах да калгаснікаў, якія добрасумленна працуюць і маюць вялікую колькасьць непрацаздольных членаў сям'і практыкаваць павышаную выдачу на турай у залік належачых ім даходаў па працадзёх, пры адпаведным зьніжэньні грашовай часткі даходаў.

7. Пытаньне аб утварэньні харчовага фонду для арганізацыі арцельнага харчаваньня калгаснікаў у часе палявых работ, а таксама разьмер і парадак яго ўтварэньня вырашаецца агульным сходам калгаснікаў.

8. Пры разьмеркаваньні фуражу па вінна ўлічвацца наяўнасьць жывёлы ў калгаснікаў з тым, каб калгаснікі, якія не атрымліваюць фуражу, або атрымліваюць яго менш, узамен гэтага атрымлівалі-б іншыя віды натуральнай прадукцыі, ня выходзячы аднак за мэжы ўстаноўленага ў даным калгасе разьмеру натуральных выдач на працадзень.

9. Адміністрацыйна-упраўленчы і рахункаводны апарат калгасаў, незалежна ад колькасьці выпрацаваных імі працадзён, ня можа атрымаць хлеба чавога збожжа і іншых прадуктаў больш той колькасьці, якую ў сярэднім атрымалі ў даным калгасе калгаснікі сталай брыгады, якія добрасумленна выконвалі на працягу году ўсе даручаныя ім работы, з тым, што кошт недатыкальнай натуральнай часткі даходаў па выпрацаваных адміністрацыйна-ўпраўленчымі работнікамі працаднёх кампэнсуецца грашыма.

10. Пры разьмеркаваньні натуральнай часткі даходаў па працаднёх уключаюцца і працадні, выпрацаваныя трактарыстамі—членамі данага калгасу на трактары МТС, як у сваім калгасе, так і ў іншых калгасах.

Калі сума кошту прадуктаў, якія атрымлівае трактарыст па працаднёх, перавышае суму тых даходаў, што прыпадаюць на працадні, выпрацаваныя ім у калгасе, членам якога ён зьяўляецца, дык трактарыст выплачвае розьніцу свайму калгасу грашыма па дзяржаўных загатоўчых цэнах.

Разьмеркаваньне грашовай часткі даходаў

Грашовая частка даходаў у калгасах разьмяркоўваецца наступным чынам:

1. У першую чаргу з грашовых даходаў калгасу ўтвараюцца:

а) усе плацяжы па крэдытах, якія трэба пагасіць у 1932 г., аплата сельскагаспадарчага падатку, страхоўкі і іншых абавязацельстваў калгасу;

б) набыцьцё акцый Трактарацэнтру;

в) аплата МТС за праведзеныя ёю работы;

г) адлічэньне ў непадзельны фонд.

2. Апроч таго з грашовых даходаў калгасу адлічаюцца:

а) усе зробленыя на працягу году вытворча-гаспадарчыя і адміністрацыйныя выдаткі.

Сумы, якія адлічваюцца з даходаў таварных фэрм на прэм'яваньне і на заатэхнічнае абслугоўваньне фэрм, а таксама сродкі, што уносяцца ў калгасаюз на ўтрыманьне калгасаюзаў уключаюцца ў вытворча-гаспадарчыя і адміністрацыйныя выдаткі;

б) тая сума даходаў, што прыпадае на працадні трактарыстаў МТС, выпрацаваныя імі на трактары па ўстаноўленым для іх гарантыраваным мінімуме (у тых калгасах, дзе ацэнка працадня ніжэй гарантыраванага мінімуму для трактарыста);

в) сумы выплачаныя на працягу году сьвінаром за выкананьне плянаў па здачы прадукцыі і захаваньні парасят.

3. Уся астатняя сума грашовых даходаў, пасьля ўказаных адлічэньняў, разьмяркоўваецца паміж калгаснікамі (дадаецца да сумы кошту прадукцыі, якая атрымана па працаднёх) у адпаведнасьці з устаноўленай ацэнкай працадня.

Улік даходаў і праверка за пісаў працадзён

1. Праўленьні калгасаў павінны не пазьней 30 жніўня правесьці дэталёвую праверку ўліку працадзён і запісу іх у працоўныя кніжкі калгаснікаў за ўвесь пэрыяд работ ад пачатку году з тым, каб кожны калгасьнік добра ведаў колькасьць выпрацаваных ім працадзён.

2. Для правядзеньня гэтай работы ў кожным калгасе арганізаваць праверачныя камісіі ў складзе старшыні праўленьня калгасу, старшыні рэвізійнай камісіі, двух калгаснікаў, выбраных агульным сходам і брыгадзіра той брыгады, працадні якой правяраюцца.

Камісія правярае, ці сваячасова і правільна налічваюцца калгаснікам працадні за выкананую работу, ці сваячасова яны запісваюцца ў працоўныя кніжкі і ці не перавышае агульная колькасьць працадзён, налічаных усёй брыгадзе, тэй колькасьці, якая ўстаноўлена па вытворчым заданьні.

Пасьля праверкі складаюцца сьпісы калгаснікаў па брыгадах з указаньнем колькасьці выпрацаваных кожным калгаснікам упаасобку працадзён з пачатку году і вывешваецца на відных мясцох ва ўсіх паселішчах калгасаў. А таксама шырока абмяркоўваюцца на агульным сходзе калгаснікаў вынікі іх удзелу ў веснавой сяўбе, праполцы, уборцы, жывёлагадоўлі і будаўніцтве.

3. Абавязаць рэвізійныя камісіі калгасаў правесьці да 30 жніўня праверку паступленьня і выдаткаваньня сродкаў і прадуктаў, правільнасьці і сваячасовасьці запісаў па кнігах, выявіць завінавачанасьць калгасаў па атрыманых крэдытах, сваячасовасьць пагашэньня плацяжоў па крэдытах, па набыцьці акцый Трактарацэнтру і т. д.; праверыць таксама завінавачанасьць розных устаноў і арганізацый калгасу за рэалізаваную прадукцыю, праверыць запіс выданых калгаснікам авансаў як грашыма, так і натурай і правільнасьць выдачы іх па працаднёх. Вынікі праверкі абмяркаваць на паседжаньнях праўленьняў і агульных сходах калгаснікаў.

4. Абавязаць праўленьні калгасаў наладзіць у часе правядзеньня ўборачнай кампаніі дакладны і поўны ўлік зьбіраемага ўраджаю з вытворчага вучастку кожнай паасобнай брыгады па кожнай культуры, арганізаваць дакладны ўлік колькасьці ўраджаю ў кожным паасобным памяшканьні (гумнах, сьвірнах, скляпох, капцах і т. д.):

5. Не пазьней 15 кастрычніка г.-г. па ўсіх калгасах павінны быць складзены папярэднія пляны разьмеркаваньня даходаў, на аснове дакладных падлікаў ужо сабранага ўраджаю, атрыманых даходаў і папярэдніх падлікаў астатняй часткі ўраджаю і ўсіх даходаў, якія калгас мяркуе атрымаць да 1-га студзеня 1933 г.

6. Складзеныя папярэднія пляны разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў шырока абмяркоўваюцца ў вытворчых брыгадах і на агульных сходах калгаснікаў.

7. Абавязаць калгассаюзы не пазьней 1-га сьнежня 1932 г. падагуліць вынікі папярэдняга разьмеркаваньня даходаў па ўсіх калгасах раёну на аснове складзеных у колгасах папярэдніх плянаў разьмеркаваньня і дасlaць у Калгаспэнтр БССР.

К канчатковае разьмеркаваньне і разьлік з калгаснікам

1. Калегія НКЗБ і праўленьне Калгасцэнтру абавязваюць усе райсаюзы, праўленьні калгассаюзаў і МТС правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) на працягу з 15 па 25 жніўня правесьці ва ўсіх раёнах 1—2—дзённыя курсы - канфэрэнцыі старшынь калгасаў для дэталёвай прапрацоўкі прынцыпаў і парадку разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў 1932 г.

б) не пазьней 15 жніўня правесьці ва ўсіх раёнах нарады старшынь рэвізійных камісій калгасаў, на якіх абмяркаваць як прынцыпы і парадак разьмеркаваньня даходаў, так і задачы рэвізійных камісій у справе правільнай пастаноўкі ўліку працы і ўсёй гаспадарчай дзейнасьці калгасу:

в) арганізаваць шырокую прапрацоўку пастановы калегіі НКЗБ і праўленьня Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні даходаў у брыгадах і на агульных сходах калгаснікаў, для чаго калгассаюзам і МТС забясьпечыць пасылку работнікаў у калгасы для правядзеньня гэтай работы;

г) у другой палове жніўня г.-г. правесьці ва ўсіх раёнах 2—3-дзённыя курсы-конфэрэнцыі рахункаводаў калгасаў для прапрацоўкі пытаньняў аб парадку складаньня плянаў разьмеркаваньня даходаў за 1932 г.

2. Наркомзем і Калгасцэнтр абавязваць калгассаюзы, райсаюзы і МТС для аказаньня рэальнай дапамогі праўленьням калгасаў і кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю прымацаваць да групы 5—7 калгасаў па адным работніку з кіруючага складу зямельнага аддзелу, калгассаюзу, МТС і іншых раённых арганізацый з тым, каб гэтыя работнікі заставаліся ў калгасах да поўнага сканчэньня работ па разьмеркаваньні даходаў у вызначаныя тэрміны.

3. Даручыць райсаюзам, калгассаюзам і МТС забясьпечыць шырокі ўдзел і дапамогу ў разьмеркаваньні даходаў у калгасах з боку настаўнікаў, рахунковых работнікаў раёну, сельсаветаў, сельспажаў і іншых культурных сіл раёну і вёскі.

4. Абавязаць праўленьні калгасаў і калгассаюзаў забясьпечыць такі парадак, каб паступаючыя ад калгаснікаў скаргі на няправільна праведзеныя з імі разьлікі былі-б уважліва разгледжаны на працягу ня больш 3—5 дзён і па іх былі прыняты адпаведныя меры.

5. Абавязаць райсаюзы і калгассаюзы вылучыць у кожным раёне па адным калгасе, у якім правесьці ў першую чаргу работу па папярэднім разьмеркаваньні даходаў з тым, каб на яго вопыце арганізаваць работу ў астатніх калгасах раёну.

6. НКЗ і Калгасцэнтр БССР папярэджваюць райсаюзы, калгассаюзы і МТС, што недастатковае правядзеньне растлумачальнай работы, падмена самадзейнасьці саміх калгасных мас голым адміністраваньнем, несваячасовае правядзеньне разьмеркаваньня даходаў і разьлікаў з калгаснікамі, памылкі і скажэньні ў разьмеркаваньні даходаў будуць разглядацца, як злачынства, накіраванае на зрыў справы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у іх арцельнай форме, як дапамога кулаку ў яго рабоце, накіраванай супроць калгаснага будаўніцтва.

Нам. Народнага Камісара Земляробства БССР

МАСЮКОЎ.

Нам. Старшыні праўленьня Калгасцэнтру БССР

СТРЭЛЕ.

УРАДЖАЮ ДЭТАЛЁВЫ ЎЛІК І САХРАННАСЬЦЬ.

Калгасная брыгада ўзьвешвае абмалочанае зярно.

ЦЭНТРАЛЬНАМУ ВЫКАНАЎЧАМУ КАМІТЭТУ І САУНАРКОМУ БССР

Пачынаючы сваю работу, 1 сэсія Ўсебеларускага Вучонага Мэдычнага Савету шле вярхоўным органам БССР—ЦВК і СНК шчырае прывітаньне.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б дасягнуты вялізарнейшыя посьпехі на ўсіх вучастках гаспадарча-культурнага разьвіцьця і ў справе сацыялістычнай аховы здароўя.

Сэсія Вучонага Мэдычнага Савету, разглядаючы вынікі першай пяцігодкі па ахове здароўя і першы варыянт другой пяцігодкі сацаховы здароўя запэўнівае вярхоўную ўладу БССР—ЦВК і СНК, што ўсе мэдработнікі БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б забясьпечаць выкананьне і перавыкананьне плянаў сацыялістычнай аховы здароўя ў 4 заключным годзе, прыкладуць усе свае сілы, веды і энэргію на ажыцьцяўленьне 2-й пяцігодкі.

Няхай жыве БССР!

Няхай жыве кіраўнік сацыялістычных перамог—камуністычная партыя Беларусі!

Няхай жыве ЎсеКП(б) і правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. СТАЛІН!

Прэзыдыум Сэсіі.

Брыгада рабочых па пагрузцы збожжа для адпраўкі на элеватар.

Сельска-гаспадарчую навуку--на палі саўгасаў і калгасаў

«Работа навукова-дасьледчых інстытутаў ні ў якім разе не павінна абмяжоўвацца сьценамі лябараторый. Увага навукова-дасьледчых установаў павінна быць зьвернута з асаблівай вастрэтой на задачы, якія высоўваюцца плянам 1932 году. Увага тэхнічнага акты ву і гаспадарнікаў павінна быць з усёй сілай завострана на задачах тэхнічнага кіраўніцтва. Толькі пры такіх умовах можна будзе пераможна рашыць задачы, што высоўваюцца плянам 1932 г.». Так азначыла XVII партканфэрэнцыя задачы, якія стаяць перад навукова-дасьледчымі ўстановамі ў пераможным завяршэньні задач 1932 г. і падрыхтоўку тэхніка-эканамічнай базы пад будаўніцтва 2-й пяцігодкі.

Як жа сельска-гаспадарчыя, навукова-дасьледчыя арганізацыі БССР (інстытуты, занальныя дасьледчыя станцыі) выконваюць гэтыя надзвычайна важнасьці дырэктывы, пастаўленыя перад імі партыяй і ўрадам?—Трэба з усёй балышавіцкай праматой сказаць, што большасьць гэтых арганізацый на сёнешні дзень яшчэ поўнасьцю далёка не ажыцьцяўляюць гэтыя дырэктывы. Яны яшчэ не перабудавалі сваёй работы тварам да саўгаснай і калгаснай вытворчасьці. Праверка вытворчамасавай работы цэлага раду навукова-дасьледчых арганізацый сельскай гаспадаркі БССР з усёй відавочнасьцю паказала, што яны яшчэ не асвоілі на практыцы 6 гістарычных указаньняў тав. СТАЛІНА, якія зьяўляюцца асноўным вагарам у выкананьні іх вытворчых заданьняў. Яны забыліся аб тым вялізарным значэньні, якое мае, «саправіднае супрацоўніцтва навуковых і тэхнічных дзеячоў з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва» (МОЛАТАЎ).

Мова фактаў і лічбаў з усёй нагляднасьцю можа характарызаваць становішча з разгортваньнем навукова-дасьледчай работы ў шмат якіх інстытутах і занальных станцыях БССР і з прасоўваньнем навуковых дасягненьняў у практыку саўгасаў і калгасаў.

Характарным у гэтых адносінах зьяўляецца работа навукова-дасьледчага калгаснага інстытуту (НДКІ). НДКІ, як самастойная арганізацыя, арганізаваўся ў маі 1932 г. Аднак, будзе няправільна лічыць пачатак навукова-дасьледчай работы НДКІ іменна з гэтага пэрыяду. Фактычна НДКІ становіў сабою аддзел беларускага інстытуту сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, які заснаваны ў 1927 г. У пэрыяд 1927-1929 гг. кіраўніцтва інстытуту сацрэканструкцыі ўзначальвалася нацдэмаўцамі (беларускія і «сама бытнікамі») на чале з Гарэцкім, якія праводзілі яўную контр-рэвалюцыйную лінію ва ўсёй рабоце інстытуту. Толькі ў 1929 годзе пры разгроме ў БССР асяродкаў контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму было разбурана і тое, гнязда, якое зьвіў сабе ў інстытуце сацрэканструкцыі нацыянал-дэмакратызм. На чале інстытуту стала новае кіраўніцтва. Аднак і новае кіраўніцтва не прыняло належных мер для саправіднага разгортваньня навукова-дасьледчай работы, для ўцягненьня ў гэту работу шырокіх мас рабочых саўгасаў і калгаснікаў. Баючыся памылак у вырашэньні тых або іншых пытаньняў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, новае кіраўніцтва палічыла за лепшае працаваць павольна, значна ад стаючы ад балышавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва савецкай краіны.

Што-ж мы маем на сёнешні дзень у НДКІ? НДКІ мае ў сваім складзе 4 групы: арганізацыі працы, фінансава-эканамічная, жывёлагадоўчая і землеўпарадкаваньня. Усяго ў інстытуце на лічваецца 10 навуковых работнікаў. Цяжка вядома гаварыць аб разгортваньні масавай работы пры такой наяўнасьці кадраў. Калі работнікі інстытуту часам і бываюць на гэтых пунктах, дык іх інструктаж зьяўляецца чыста «гастралёрскім». Масавага аддзелу і сэктару тэхніча-вытворчай прапаганды НДКІ ня мае. Адсутнічае таксама ў НДКІ і бюро рацыяналізацыі і вынаходзтва (БРВ). Вельмі цяжка пасьля гэтага гаварыць аб якой-небудзь сувязі, больш або менш моцнай і шчыльнай, з калгасамі. Трэба адзначыць над звычайна характарную акалічнасьць: значная частка бюджэтных сродкаў на апэрацыйныя расходы на 1931 год ня была скарыстана. Гэты факт яскрава і наглядна малюе «размах» работы НДКІ.

Уся аргмасавая работа НДКІ зводзіцца да ўдзелу ў рознага роду нарадах пры НКЗеме Беларусі. Праўда, за апошні час інстытутам праведзена вялікая работа па прапрацоўцы арыентыровачнага пляну 2-ой пяцігодкі сельскае гаспадаркі БССР, прычым гэта работа ўжо прадстаўлена на зацьвярджаньне ў НКЗем Беларусі. Апроч гэтага прапрацоўваюцца пытаньні арганізацыі калгаснага гандлю. Удзел НДКІ ў рэспубліканскім і раённым друку аб межаваўся за ўвесь пэрыяд падрыхтоўкі пасеўнай кампаніі 1932 г. і самой пасеўнай кампаніі 2-3 артыкуламі. Апроч гэтага выпушчаны збор артыкулаў, які, аднак, па сваёй каштоўнасьці і зьмесьце далёка недаступны радавому калгаснику.

Намесьнік дырэктара па навукова-дасьледчай частцы тав. Палубінскі тлумачыць адсутнасьць масавай работы тым, што НКЗем БССР адцягвае навуковых работнікаў НДКІ на рознага роду гаспадарчыя работы па лініі НКЗему і тым самым выхалашчвае інстытут ад работнікаў.

Гэтыя тлумачэньні зьяўляюцца ні чым іншым, як спасыланьнямі на слабутыя «аб'ектыўныя прычыны». Ці не зьяўляецца гэта праваапартуністычнай тэорыяй на практыцы?

Прыблізна, такое-ж становішча і ў саўгасным інстытуце (НДСІ). Саўгасны інстытут, як і НДКІ, зьяўляўся аддзелам інстытуту сацрэканструкцыі. НДКІ мае наступныя групы: гаспадарчага разьліку, арганізацыі працы, прыгарадных гаспадарак, электрыфікацыі і сабе кошту. Але было-б вельмі праблематычным лічыць гэтыя групы поўнацэннымі, прымаючы пад увагу, што ў НДСІ ўсяго 10 навуковых работнікаў. І з гэтых 10 частка сыстэматычна адрываецца НКЗемам Беларусі для работы не па прызначэньні.

Дырэктар НДСІ тав. Белавусаў б'ецца, як рыба аб лёд, за тое, каб некалькі ўвесьці ў належнае рэчышча работу інстытуту. У сучасны момант работнікі інстытуту прапрацоўваюць праблемы севазвароту, электрыфікацыі і сыравінай базы БССР у другой пяцігодцы. Частка гэтых праблем ужо прапрацавана і ўнесена на зацьвярджаньне ў НКЗ БССР. У стадыі прапрацоўкі знаходзяцца наступныя тэмы: гаспадарчы разьлік у саўгасах, галоўным чынам сьвінагадоўчай, сабекошт прадукцыі, арганізацыя працы ў сьвінасаўгасах і г. д.

НДСІ мае два апорных пункты, але, як і НДКІ, з-за адсутнасьці масавага аддзелу і сэктару тэхнікапрапаганды неда статкова разгортвае работу з рабочымі саўгасу. Частка тэм з прычыны гэтага зьяўляюцца фактычна габінэтнымі таму, што шырокая саўгасная масава ня ўцягнута да ўдзелу ў прапрацоўцы 2-ой пяцігодкі па саўгасным будаўніцтве БССР.

«Сакрэт дрэннай работы і НДКІ і НДСІ хаваецца яшчэ, галоўным чынам, у тым, што інстытут сацрэканструкцыі, у складзе якога яны знаходзіліся, знаходзіцца ў стадыі бесьперапыннай рэарганізацыі. А пакуль такая бесьперапынная пературбацыя вельмі дрэнна адбіваецца на рабоце гэтых інстытутаў.

Гэты «канвэйер» агідны пастаноўкі арганізацыйна-масавай работы ў саўгасах і калгасах распаўсюджваецца і па лініі іншых навукова-дасьледчых арганізацый БССР.

З некаторымі варыянтамі і ў лепшы і ў горшы бок працуе цэнтральная бульбяная станцыя БССР. Гэта станцыя знаходзіцца ў сыстэме ўсесаюзнага інстытуту бульбяной гаспадаркі і НКЗ БССР і існуе з 1928 г. (з 1928 г. па 1931 г. як сэлекцыйны рассаднік). Станцыя мае 8 аддзелаў (група тэхпропу). Аднак недастатковае ўкамплектаваньне тэхпропу (усяго адзін чалавек) не дае магчымасьці належным чынам разгарнуць арганізацыйна-масавую работу ў саўгасах і калгасах. Навукова-дасьледчыя дасягненьні слаба прасоўваюцца ў практыку сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Усё-ж у параўнаньні з НДКІ і НДСІ цэнтральная бульбяной станцыяй праведзена некаторая масавая работа. У саўгасах і калгасах закладзена: 40 вытворчых вучасткаў па сортавыпрабаваньне, супольна з аграхімлябораторыяй зроблена 40 вытворчых вопытаў па хімізацыі, абсьледвана 2.000 га бульбяных раёнаў па выяўленьні чыстагатунковых відаў бульбы. У 1932 годзе станцыя мяркуе правесьці суцэльнае абсьледваньне па сортавыпрабаваньні ў асноўным бульбяных раёнаў БССР.

Значная работа праведзена станцыяй па выкоўваньні кадраў калгаснага і саўгаснага актыву: прапушчаны праз курсы па хаваньні і сілаваньні бульбы ў 60 чалавек, праз курсы па апрабацыі бульбы—30 чалавек і курсы калгасных брыгадзіраў 50 чалавек.

Значна горш абстаіць справа з удзелам станцыі ў друку. За выключэньнем двух артыкулаў у «Зьвязьдзе» і «Савецкай Беларусі» навуковыя работнікі станцыі (15 чалавек) ня прымалі ніякага ўдзелу ў перадачы вопыту дасьледчай работы праз друк у саўгасы і калгасы. Праўда, станцыяй зданы ў друк аграправілы і брашура па барацьбе са шкодзікамі бульбы, па насьневодзтве ў БССР, хаваньні і ўборцы, але наўрад ці яны ўбачаць сьвет у 1932 г., таму, што зданы ў друк несваячасова.

Станцыя фактычна пачала сваю навукова-дасьледчую работу толькі ў 1931 годзе. Ёю прапрацавана значная колькасьць тэм па ўгнаеньні, па глебазнаўстве, па хваробах бульбы і г. д.

Адсутнасьць дастатковай колькасьці сродкаў значна тармозіць работу аддзелу мэханізацыі.

Надзвычайна вузкім месцам у работе станцыі зьяўляецца адсутнасьць БРВ. Падсобныя рацыяналізатары і вы находцы ёсьць і на самай станцыі. На прыклад, тав. Закржэўскі вынайшоў для ўзважваньня вопытных пасудзін з расьлінамі. Тав. Закржэўскі мае і цэлы рад іншых вельмі каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў, а таксама і вынаходніцтва. Але адсутнасьць БРВ, а так сама сродкаў для разгортваньня работы па мэханізацыі, замаражвае гэтыя каштоўныя прапановы. Вельмі цяжка гаварыць аб разьвіцьці рацыяналізатарскай і вынаходніцкай думкі ня толькі ў саўгасах і калгасах, але і на самой станцыі.

Як-жа станцыя аказвае вытворчую дапамогу саўгасам і калгасам, як яна прасоўвае ў практыку сацыялістычнага земляробства свае праверяныя дасягненьні? На гэта запытаньне дакладны адказ можа даць становішча ў саўгасе «Вялікая Сьляпянка», на базе якога працуе станцыя. У мінулым 1931 годзе бульба на вучастку 25 га з прычыны няўжываньня элемэнтарных правілаў агратэхнікі вусім прапала. Саўгас неяк зьвёў канцы з канцамі толькі дзякуючы добраму ўраджаю гародных пасеваў. Па гэтым ня цяжка меркаваць аб вытворчай сувязі станцыі з саўгасамі і калгасамі. Праўда, падсобныя дасягненьні ў галіне барацьбы з хваробамі бульбы перадаваліся непасрэдна на вытворчасьць, але штодзённай сыстэматычнай сувязі з с.-г. вытворчасьцю станцыя на сёнешні дзень ня мае.

Слаба дапамагае станцыі ў мэханізацыі вытворчых працэсаў і Беларускі філіял УсеІМЭ (Усесаюзны інстытут мэханізацыі і электрыфікацыі).

Чаму торфазавод „1 мая“ за 5-га жніўня даў 150,4 проц. выкананьня, а за 6-га жніўня ўсяго 33,5 проц.?

АБ СУПРОЦЬПАЖАРНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАХ

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 9-га жніўня 1932 г.

У сувязі з засушлівым надвор'ем за апошні час учасьціліся пажары лясоў і тарфяных балот.

Устаноўлена, што прычынамі пажараў у радзе выпадкаў зьяўляецца злачынна-нядбайнае абыходжаньне з агнём і няпрыняцьце патрэбных папярэдніх мер (раскладаньне агню ў лесе, курэньне на складах лесу і торфу, непадрыхтаванасьць супроцьпажарных сродкаў, адсутнасьць патрэбнага інструктажу лясной аховы і аховы тарфяных балот на выпадак узьнікненьня пажару і г. д.), а таксама бязьдзейнасьць адміністрацыйных і гаспадарчых органаў пры ўзьнікненьні пажараў і пры іх ліквідацыі.

З прычыны гэтага Савет Народных Камісараў Саюзу ССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць НКлесправ, НКЗем, НКШЗ і НКТправ прыняць бездакладныя меры па ўзмацненьні аховы лясоў і тарфяных балот па правядзеньні супроцьпажарных мерапрыемстваў, па рашучым умацаваньні дысцыпліны ў органах аховы і па павялічэньні на бліжэйшы пэрыяд супроцьпажарных пастоў.

2. Абавязаць СНК саюзных рэспублік і краявыя (абласныя) выканкомы мабілізаваць усе мясцовыя органы на барацьбу з пажарамі і асабліва на правядзеньне неабходных папераджальных мер і прадаставіць СНК саюзных рэспублік і краявым (абласным) выканкомам права ў неабходных выпадках увядзеньня працгужпавіннасьці.

3. Прапанаваць судовым органам саюзных рэспублік, пракуратуры і АДПУ узмацніць меры рэпрэсій у адносінах да вінавайцаў пажараў, а таксама і ў адносінах да асоб, вінаватых у бязьдзеяньні і няпрыняцьці па пераджальных мер.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР **М. Молатаў (Скрабін).**
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР **П. Керждацаў.**

Б'ЁМ ТРЫВОГУ

За 6-е жніўня сутачная праграма па Белторфаб'яднаньню выканана ўсяго па 30,2 проц.—здабыта 2.516 тон торфацэглін. Ні адзін з паасобных заводаў ня выканаў дзённай праграмы. Наадварот, выкананьне пляну ганебна зьнізілі ў параўнаньні з 5-м жніўня. Так завод «1-га мая» за 5-е жніўня даў паказьнік выкананьня—150,4 проц., а за 6-е жніўня 33,5 проц., тое-ж самае здарылася і з большасьцю астатніх заводаў. Патрэбны рашучыя захады з боку кіраўніцтва торфазаводамі, партыйных і прафсаюзных арганізацый іх, каб тэмпы здабычы торфу ўзьняць.

Гадавы плян выкананы ўсяго на 44,5 проц. Са зводкі відаць, што па заводах Белторфаб'яднаньня няма яшчэ належнага зруху ў выкананьні плянаў торфаздабычы.

У тыя рашаючыя дні, што засталіся да сканчэньня торфасэзону, павінны быць мабілізаваны ўсе сілы на выкананьне праграм па торфаздабычы.

Спасылаюцца на „аб'ектыўныя“ ўмовы

Належнага пералому ў рабоце торфарцеляй Рагачэўшчыны ў бок поўнага выкананьня пляну торфаздабываньня ўсё яшчэ няма.

На 25 ліпеня сэзонны плян торфаздабываньня па раёне выкананы толькі на 45,6 проц.

Нарада кіраўнікоў торфаарцеляй па пытаньні выкананьня пляну торфаздабываньня, якая адбылася 24 ліпеня выявіла шмат хворых бакоў у рабоце торфарцеляй. Гэтыя недахопы ў асноўным зводзяцца да таго, што амаль у кожнай торфарцелі наглядаецца вялікая цякучасьць рабочай сілы, недастаткова пастаўлена забясьпечаньне рабочых-тарфянікаў спэцвопраткай і некаторымі з прадуктаў харчаваньня (мяса і масла), адсутнічае палітыка-выхаваўчая і культмасавая работа сярод рабочых торфараспрацовак, ігнаруюцца шэсьць сталінскіх умоў і зусім слаба разгортваюцца сацыялістычныя мэтады працы—сацпаборніцтва і ўдарніцтва. Асабліва вялікай зьяўляецца цякучасьць рабочай сілы ў апошні час. З 1200 рабочых, якія працавалі раней на торфараспрацоўках, каля 800 рабочых пакінулі работу. Асобныя торфарцелі здабычу торфу зьнялі да мінімуму. Гэта зьяўляецца сур'ёзнай пагрозай зрыву торфаздабываньня.

А між тым, кіраўнікі торфарцеляй ня прымаюць колькі-небудзь энэргічных захадаў да забясьпечаньня торфараспрацовак рабсілай шляхам заключэньня дагавораў з калгасамі і аднаасобнікамі, пусьціўшы гэту работу на хвалі самацёку. Паасобныя работнікі торфарцеляй раёну (Малашкавічы)—т. Тараканаў, (Забалацьце)—т. Ткачоў, т. Кінцікаў (Гарадзец) ды іншы. Імкнуцца апраўдаць прарыў у торфаздабываньні апартуністычным спасыланьнем на «аб'ектыўныя» ўмовы (вільготнасьць мясцовасьці і частыя дажджы, адсутнасьць некаторых прылад, якія лёпка можна было-б набыць непасрэдна на мясцох і г. д.)

Корань зла такога вялікага недавыкананьня пляну торфаздабываньня (торфарцель Малашкавічы плян выканала на 62 проц.) Надзейкавічы—толькі 30 проц., Востраў—25 проц., Гарадзец—48 проц., Забалацьце—25 проц., Ямна-Крычаўская—66 проц. — заключаецца не ў «аб'ектыўных» прычынах, а ў нежаданьні і няўменьні працаваць і правільна кіраваць самі-ж кіраўнікоў гэтых арцеляй.

Трэба сказаць, што і мясцовыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі, прафарганізацыі і сельсаветы амаль не дапамагаюць торфаарцелям пасьпяхова выканаць іх прамфінплян, іх работы там ня відаць, а ў лепшым выпадку яна зводзіцца да заслухоўваньня справаздач кіраўнікоў арцеляй аб ходзе работы, нікому не патрэбных «налётаў», бяз сур'ёзнага ўніканьня ў сутнасьць справы З абыякавымі адносінамі з боку мясцовых партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый і ўстанаў да работы торфаарцеляй трэба раз і назаўсёды пакончыць. У гэтай справе патрэбен безадкладны і рашучы пералом.

Ажыўіць культмасавую і палітыка-выхаваўчую работу, ліквідаваць цякучасьць рабсілы і самацёк у рабоце, ажыцьцявіць 6 умоў т. Сталіна ў штодзённай рабоце кожнай тарфяной арцелі і на гэтай аснове поўнасьцю і ў тэрмін выканаць плян торфаздабываньня—такава важнейшая задача ня толькі саміх торфарцеляй і Райсампрамсаюзу цалкам, але і кожнай партыйнай і камсамольскай ячэйкі, сельсавету і прафарганізацыі.

Хв. Куляшоў.

Змагацца за якасьць торфу

На 1-е жніўня па торфаарцелях Дзяржынскага раёну на месцы поля сьцілкі ляжыць 46221,8 тон торфу, 70 проц. якога зусім сухі і чакае штабялёўкі. Да гэтага часу заштабялёваны толькі 25 проц. здабытага торфу. Гэта вынік таго, што паасобныя торфарцелі паслабілі тэмпы па прасушцы здабытага торфу і ўсю гэту работу пусьцілі на самацёк.

Чэрапаўшы тэмпы работы па штабялёўцы пагражаюць пляннаваму забясьпечаньню прамысловасьці добраякаснай паліваваай прадукцыяй.

Коскаўская, Крысаўская, Загуранская, Дубінская і Чэрнікаўская торфаарцелі ня здолелі замацаваць рабочую сілу на ўвесь торфасэзон і зараз наглядаецца цякучасьць яе. Старшыні гэтых арцеляй Чыкун, Навіцкі, і Гарма за слаба кіруюць работай торфаарцеляй.

Сельсаветы, установы, грамадзкія арганізацыі і шэф торфараспрацовак РК камсамолу зусім мала зьвяртаюць увагі на гэтую работу, не дапамагаюць торфаарцелям змагацца за выкананьне праграмы торфаздабычы.

Да канца торфасэзону засталося ня многа часу. Неабходна ў гэтыя дні мабілізаваць усе сілы і ліквідаваць гаўбебны прарыў у штабялёўцы здабытага торфу. Дзяржынская камсамолія павінна не на паперы, а на справе ўзяцца за актыўную дапамогу ў рабоце торфаарцеляй шляхам пасылкі камсамольскіх брыгад на торфараспрацоўкі.

Торфянік.

Райком камсамолу абяцаў...

БАБРУЙСК. Тэмпы торфаздабычы на торфазаводзе «Новая Беларусь» за апошні час рэзка зьнізіліся. За 5-ю пяцідзённку ліпеня плян выкананы на 27 проц. Агульны плян торфаздабычы дасягае толькі 50,4 проц., прычым здабыча фрэзэрнага торфу зусім спынілася. Наглядаецца вялікая цякучасьць рабочай сілы. Гаспадарчае кіраўніцтва заводам, прафэсыянальныя і каапэрацыйныя арганізацыі не забясьпечылі нармальных умоў для работы. Сталоўка працуе дрэнна, яна не забясьпечана прадуктамі. У выніку дрэннага забясьпечаньня і нездавальняючых бытавых умоў наглядаецца цэлы рад выпадкаў, калі рабочыя пакідаюць завод.

Санітарныя ўмовы жыцьця рабочых надзвычайна дрэнныя. У інтэрнатах брудна, не наладжана мэдабслугоўваньне, не вядзецца культурна-масавая работа.

Стварылася пагроза папсаваньня 10-ці тысяч торфацаглін, якія да гэтага часу ня ўбраны. Раённыя арганізацыі не прымаюць адпаведных мер для ўзмацненьня работы торфазаводу. Райком камсамолу абяцаў мабілізаваць 20 камсамольцаў, але да гэтага часу свайго абяцаньня ня выканаў.

Белта.

Зьнішчыць валакіту з выплатай зарплаты

Коскаўская тарфяная арцель, Дзяржынскага раёну ў торфасэзоне гэтага году працавала без перабояў. Рабочай сілай арцель была забясьпечана. У выніку плян тарфасэзону выкананы на 92,2 проц., але зусім дрэнна абстаіць справа з выплатай рабочым зарплаты. Па многіх месяцах не вытвараецца разьліку. Быў выпадак, калі старшыня калгасу Чыкун паведаміў, што 23 ліпеня будуць выплачваць грошы ў тарфяной арцелі і 25 калгасьнікаў паехалі за імі. Патрацілі ў такую гарачую пару рабочы дзень, а зарплаты не атрымалі, бо рахункавода Лысякова там не знайшлі.

Старшыня арцелі Кунцэвіч не кланоціцца аб сваячасовай выплаце зарплаты. Прадукты таксама выдавалісія каму папала і як папала.

Такая пастаноўка з выплатай зарплаты зрывае нармальную работу торфарцелі. За такую агідную валакіту з выплатай зарплаты вінаватыя павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Рабкор.

„Куды ні скардзіўся,--нідзе ніякага ратунку“

(Ліст селькора)

Пры арганізацыі калгасу ў в. Парэчча, Кнорынскага сельсавету, Пухавіцкага раёну першымі ўступілі ў калгас **Шашок Сьцяпан і Асаула Кірыла.** Абодвы беднякі, абодвы—малапісьменныя. Шашок Сьцяпан—член ЦВК, Асаула Кірыла—кандыдат партыі. Першыя прыйшлі ў калгас, першыя выходзілі на калгасную работу. Старшынёю калгасу быў Асаула Кірыла. Шмат прыходзілася працаваць, бо справа новая. Шмат было пагроз з боку кулацка-заможнай часткі і нават часткі беднякоў, што падпалі пад уплыў кулакоў і заможнікаў: «усёроўна зжывем з сьвету і цябе і калгас».

Перадаваліся пагрозы аднаму Асаулу бяз сьведак і было з імі цяжка змагацца. Тады Кірыл са Сьцяпанам папрасілі каб умяшаўся сельсавет, РВК, каб дапамаглі ўмацаваць калгас. Але цягнуліся дні, дапамогі ня было, а гэты час выкарыстоўвала варожая рука кулака і заможніка. Падбухторвалі асобных калгасьнікаў супроць Асаула і Шашка, раскрадалі маемасьць, збожжа, пасьля пускалі плёткі, «куды ўмешвалі старшыню калгасу, каб усякім спосабам скампрамэтаваць яго—што яму нельга давяраць калгаснай гаспадаркі.

Так, зжывалі старшыню калгасу, бедняка, кандыдата партыі. Зараз ён ужо не старшыня калгасу, яго нямаведама за што з гэтай працы вынялі. Сам Асаула аб гэтым гаворыць так: «З-за паклёпаў, што ўсклала на мяне заможная частка, ячэйка КП(б)Б выключыла мяне з партыі. Куды ні скардзіўся—нідзе ніякага ратунку. Павінны былі прыехаць з РСІ—ніхто ня едзе, а з мяне сьмяюцца:—вось, кажуць, і дажыўся. Прасіў калгас дапамагчы зрубіць хатку—ніхто не дапамог, прыходзіцца аднаму рубіць. А пасьля гэтага кажуць, што я не хачу працаваць у калгасе, зрываю калгасную работу. Сьцяпан вельмі хворы, яму трэба лячыцца, а яго цкуюць, што ён член ЦВК і калгасьнік, а нічога ня робіць».

Кнорынскі сельсавет, пад бокам якога робіцца цкаваньне гэтых таварышоў, прыступіў сваю клясавую пільнасьць, прапускаючы гэтую справу міма воч, а між іншым добра ведае пра гэта.

Ня прымаючы ніякіх захадаў, сельсавет дапамагае клясаваму ворагу зьдзек ваўца над членам ЦВК і кандыдатам партыі—першымі арганізатарамі калгасу.

У калгасе ёсьць кучка заможнікаў. Трапіўшы пад уплыў гэтых заможнікаў, частка серадняко-калгасьнікаў падбухторваюць беднякоў да выхаду з калгасу, да разбурэньня яго. Вось што кажа адна бядняка: «Не скажу хто гэта робіць, бо я баюся, а ў нас у калгасе ёсьць людзі, якія разбурваюць калгас. Напішэце ў раён, каб хто прыехаў, хай самі высьвятляць».

Як бачна, актыўная частка калгасьнікаў баіцца адкрыцьця з праўдаю, бо баіцца.

РСІ і райкалгассаюз нічога ня ўжылі для высьвятленьня гэтай справы.

Трэба ня даць, каб зьдзекваліся над беднякамі — першымі арганізатарамі калгасу і недапусьціць калгас да разбурэньня. Асаула Кірыла павінен быць адноўлены ў партыі, а калгас павінен быць ачышчаны ад варожага элемэнту.

Віньнікаў Зьм.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя просіць Пухавіцкага раённага пракурора расьсьледаваць гэтую справу і пра вынікі паведаміць рэдакцыі. Адначасова рэдакцыя просіць Пухавіцкую РКК РСІ і райкалгассаюз паведаміць, чаму ніякіх захадаў ня ўжыта па аздараўленьні калгасу в. Парэчча.

Па сьлядох рабселькораўскіх допісаў

У газэце «Савецкая Беларусь» селькор Полацкага раёну прыслаў допіс пад загалоўкам «Клясавы вораг падрывае калгасны рух». У допісе пішацца аб пакражы ячменю і пра безгаспадарчасьць у калгасах. Допіс быў накіраваны на расьследаваньне Полацкай пракуратуры. Факты пазначаныя ў допісе цалкам пацьвердзіліся.

Кіраўнік калгасу «Верны Шлях» гр. **Азарэнка** прыцягнуты да судовай адказнасьці і засуджан нарсудом на паўтара года пазбаўленьня волі.

***

Селькор Чачэрскага раёну паведамляе, што старшыня калгасу «Сталінбуд» **Мельнікаў П.** і рахункавод **Якунін** п'янствуюць на калгасныя сродкі і наогул разбураюць калгас.

Допіс накіраваны ў Чачэрскі райкалгассаюз для расьследаваньня, факты паведамленыя ў допісе цалкам пацьвердзіліся.

Мельнікаў П. зьняты з працы і справа аб ім накіравана ў Чачэрскі нарсуд для разгляду. **Якунін** зьняты з працы і яшчэ дана суровая вымова.

***

Селькор Чэрыкаўскага раёну піша, што на смалярні ў вёсцы Беліцы панує безгаспадарчасьць, п'янства і іншыя брыдоты. Допіс быў накіраваны на расьследаваньне Чэрыкаўскай пракуратуры, напісанае ў ім цалкам пацьвердзілася.

Справа накіравана ў нарсуд Чэрыкаўскага раёну для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

***

Селькор Чавускага раёну пісаў заметку пад загалоўкам «Загінулі марна». У допісе сказана, што ў м. Чавусах абурылася мураваная сьцяна, у час чаго былі ахвяры. Допіс быў накіраваны на расьследаваньне Чавускай пракуратуры, які цалкам пацьвердзіў паказаны факт.

Згодна прыгавору выязной сэсіі Вярхсуда, Старшыня Чавускага гарсавету тав. Палецкі прыгавораны да аднаго году пазбаўленьня волі, што заменена ўмоўным пакараньнем на два гады і загад, гаркамгасу Іваноўскага да аднаго году прымусовай працы.

***

Студкор Барысаўскага сьвінагадоўчага тэхнікуму паведамляе, што ў тэхнікуме пануе зацішк самакрытыкі і іншае. РК КП(б)Б сумесна з РайКК была складзена камісія для праверкі зьмешчанай у газэце заметкі, даныя заметкі пацьвердзіліся.

Кіраўніцтва тэхнікуму зьнята з працы з налажэньнем партпагнаньняў.

***

У рэд. «Савецкая Беларусь» селькор Клічаўскага раёну паведамляе, што старшыня Ганчанскага сельсавету **Салтан** і старшыня сельспажу **Казлоў** затрымліваючы тавары з Клічаўскага райсаюзу выдаюць тым, хто дасьць ім хабара.

Допіс накіраваны на расьсьледваньне пракурору Клічаўскага раёну, цалкам пацьвердзіўся.

Салтан і Казлоў зьняты з працы і адданы пад суд.

***

Допіс, надрукаваны ў № 84 газэты «Савецкая Беларусь» пад загалоўкам «Сяўбовыя замарджваюцца» пры расьсьледваньні Транспартнай пракуратурай БССР праз органы ТАДПУ, цалкам пацьвердзіўся.

Вінаватым у неваячасовай падачы пад выгрузку на ст. Полацак вагонаў, гружаных пасеўнымі грузамі, зьявіўся канторшчык па руху ст. Полацк. **Мекарэнка Яхім,** які зрабіў неправільныя разьметкі, з-за чаго гэтыя вагоны гаяліся з месца на месца. За гэта на яго накладзена праз адміністрацыю станцыі дысцыплінарнае спагнаньне—аб'яўлена суровая вымова з папярэджаньнем.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ

18 дзён—да пачатку заняткаў у школах

У Жлобінскім, Быхаўскім і Вушацкім раёнах правальваюць падрыхтоўку да „Дню вучобы“

ВІЦЕБСК ЗМАГАЕЦЦА ЗА АТРЫМАНЬНЕ ПЕРАХОДНАГА СЬЦЯГУ

Прэзыдыум Віцебскага гарсавету па станаўй уключыцца ва Ўсебеларускі конкурс на лепшую падрыхтоўку да новага навучальнага году і вызначыў рад практычных мерапрыемстваў для забясьпечаньня пасьпяховага правядзеньня гэтай кампаніі. Вырашана пабудаваць два каркасных дамы з мэтай аслабаненьня школьнай плошчы ад прыватных жыхароў. Для гэтай-жа мэты выдзелена 5 кватэр, адводзіцца 3 пакоі для настаўнікаў у новым каму начальным доме. Гарсаветам даручана выдзеліць матар'ялы для рамонту школ і забясьпечыць школы палівам.

У конкурс уключыліся таксама рэдакцыя газэты «Віцебскі Пралетарыі» і РСІ. Праведзен рэйд ударных брыгад па праверцы ходу рамонту школ, школьнага будаўніцтва, праверены таксама адзел грамадзкага харчаваньня, аддзяленьні ДКБ і БКС.

Піянэрарганізацыя Віцебску наладзіла пасты на школьных раёнах, накіравала 15 піянэрскіх брыгад для праверкі ходу падрыхтоўкі да новага навучальнага году ў сельсаветах.

Гарі КК-РСІ праведзена шырокая нарада па пытаньні аб ходзе падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Для кіраўніцтва конкурсам арганізаваны штаб, які разгарнуў сваю работу па сталым пляне. Работа штабу забясьпечвае мабілізацыю пралетарскай грамадзкасьці і шырокіх настаўніцкіх мас на пасьпяховую сустрэчу новага навучальнага году. Віцебск змагаецца за атрыманьне пераходнага сьцягу.

ГЕНДЗІНА

РАУНЯЦЦА ПА РАДУСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ

ЖЛОБІН. Да пачатку навучальнага году засталіся лічаныя дні, але падрыхтоўка да яго па раёне праходзіць злачынна маруднымі тэмпамі. Асабліва яскрава гэта паказаў апошні раённы рэйд брыгад, які праводзіўся газэтай «Шлях Сацыялізму».

У мінулым годзе ў чатырох маленькіх пакоях Скепінскай школы зьмяшчалася 275 вучняў. Сёлета школа пашыраецца яшчэ на дзьве групы. У вёсцы Скепкі па ініцыятыве грамадзкасьці і насельніцтва летась пачалі будаваць будынак для ШКМ. Сельсавет не падтрымаў актыўнасьці мас і будынак застаўся няскончаным і на сёнешні дзень. Рамонт школьных будынкаў не распачынаўся. Сельсавет, праўленьні калгасаў, ячэйка камсамолу лічаць, што падрыхтоўкай да навучальнага году павінны займацца выключна настаўнікі.

У Сенажаткаўскім сельсавеце 5 школ патрабуюць рамонту і ніхто аб гэтым ня думае. Сельсавет не абагаварыў гэтае пытаньне нават на прэзыдыуме, бо старшыні сельсавету т. Дубаву «няма часу займацца такой дробнай справай». Будынак для польскай нацыянальнай школы ў в. Цярцеж будуецца некалькі год, ніхто ня ўжывае захадаў, каб скончыць гэтае будаўніцтва і сёлета. Ня лепш справа і па іншых сельсаветах раёну.

Прыклад узорнай падрыхтоўкі да навучальнага году паказвае толькі адзін Радускі сельсавет. Пры такіх-жа ўмовах, як і ў іншых сельсаветах, тут пасьпяхова канчаецца рамонт школ, школы забясьпечаны палам, набыты падручнікі, якія толькі выйшлі з друку, зроблен дакладны ўлік дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту. Радуская ШКМ заключыла ўмову з калгасам «Вольная праца», які абавязаўся адпускаць прадукты для гарасьнедаваньняў у школе. Радускі сельсавет і настаўніцтва добра ўявілі сабе ўсю важнасьць усенавучэ і сваячасова ўзяліся за падрыхтоўку да навучальнага году. Бальшавіцкая работа Радускага сельсавету павінна зьвяцца прыкладам для ўсяго раёну і ўсёй БССР.

Усе арганізацыі і ўся працоўная грамадзкасьць раёну павінны па прыкладзе Радускага сельсавету мабілізаваца на баявую сустрэчу дню вучобы.

Закрэўскі

Быхаўскі райкамгас забясьпечвае школы... рэзалюцыямі

У Быхаўскім раёне забыліся пра тое, што 1-га верасьня «Дзень вучобы». Трэба скончыць будаўніцтва школ, шмат якія школы адрамантаваць, а пра гэта амаль ніхто не клапоціцца.

Калі зьвярнуліся да загадчыка райана за матар'ялам, дык тав. Кавлоў ад казаў: што, я вам буду шукаць матар'ялы. Настаўнікі накіраваліся ў райкамгас. Райкамгас-жа клопаты аб школе праяўляе толькі ў рэзалюцыях сваім дзесятнікам: «адпусьціць», «выканаць». На справе-ж рэзалюцыі так і застаюцца на паперы.

Ніхто ў раёне па-бальшавіцку за падрыхтоўку да навучальнага году не бярэцца. У выніку можа патрапіць леташняя гісторыя, калі школам даводзілася займацца пры пабітых шыбах і ў неадрамантаваных будынках.

Раённыя арганізацыі павінны неадкладна ўключыцца ва Ўсебеларускі конкурс і па-баявому ўзяцца за падрыхтоўку да навучальнага году. У першую чаргу трэба пусьціць поўным ходам будаўніцтва і рамонт школ.

А. ЗЯЗЮЛЯ

За рамонт ня браліся

Падрыхтоўка да новага навучальнага году па Вушацкім раёне праходзіць зусім дрэнна, ёсьць пагроза зрыву сваячасовага пачатку заняткаў. Рамонт школ у большасьці сельсаветаў не распачаты, а патрэбна адрамантаваць 43 школы.

Пабудова новых школ далёка яшчэ ня скончана. З 15 школ, будаўніцтва якіх распачата яшчэ ў 1930 годзе, сёлета, па думцы будчасткі РВК, будзе скончана толькі 8, ды і то яшчэ пры ўмове, калі будуць цьвікі, шкло і інш. матар'ялы.

Бязьдзейнасьць работнікаў райана спрыяе зрыву. Ніводная школа ў раёне поўнасьцю не забясьпечана настаўнікамі. Пасьля сканчэньня навучальнага году настаўнікі ня былі прымацаваны да паасобных школ. У самы адказны час падрыхтоўкі работнікі райана былі ў адпачынку, загадчыкі большасьці ШКМ таксама ў адпачынку.

У Зарачанскім сельсавеце сёлета трэба адкрыць ШКМ, але сельсавет да гэтага часу не падшукаў памяшканьня і ня прымае крокаў для таго, каб сваячасова адкрыць школу.

Дні, якія засталіся да 1-га верасьня, трэба ператварыць у дні штурму для зьнішчэньня перашкод на шляху да сустрэчы навучальнага году. За падрыхтоўку павінны ўзяцца партячэйкі, сельсаветы і ўсе грамадзкія арганізацыі раёну.

ЧЫРВОНЫХ.

Семяжаўскі сельсавет „дапамагае“ ўсенавучу

Ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду аб сваячасовай і належнай падрыхтоўкі да навучальнага году, па Семяжаўскім сельсавеце (Чырвона-Слабодзкі раён) падрыхтоўка зрываецца. Два гады таму назад было распачата будаўніцтва будынку для мясцовай ШКМ, але... спасыланьні на «аб'ектыўныя» прычыны давялі да таго, што зараз будаўніцтва зусім спынена.

Да рамонту школ ня прыступлена. Замест рамонту школьных памяшканьняў, замест дапамогі ў гэтай справе школе, ня больш як 5 дзён таму назад сельсавет заняў для сваіх патрэб школьны інтэрнат.

2000 р., што адпушчаны на абсталяваньне школьнай майстэрні, ня выкары стоўваюцца, а ШКМ ні майстэрні, ні рабочага пакою ня мае. Палівам школа не забясьпечана. Узімку школе было адпушчана 240 куб. мтр. дроў. З прычыны нядбайных адносін з боку сельсавету і адміністрацыі школы вывезена ня больш 30 куб. мтр., а рэшта—ляжыць у лесе, або раскрадзена.

У мэтах стварэньня фондаў для арганізацыі гарачых сьнеданьняў на школьным вучастку пасаджана бульба. Гэтая бульба зарасла пустазельлем, травяць яе і сялянскія сьвіньні.

Загадчык школы, яго намесьнік, настаўнікі—зараз усе ў адпачынку і ніхто ня думае, каб вынішчыць усе недахопы і разгарнуць па-баявому падрыхтоўку да навучальнага году. Ня думае аб гэтым і райана.

Вучань

Забясьпечыць школу ўсім патрэбным— задача сельсаавету

Як толькі скончыліся заняткі ў 1931-1932 навучальным годзе, Сьвяцкая ШКМ (Рагачэўскі раён) адразу-ж пераключылася на падрыхтоўку да новага навучальнага году. Яшчэ ўвесну быў праведзены ўлік дзяцей школьнага ўзросту, якія падлягаюць абавязковаму навучаньню на базе сямігодкі. Тады-ж адбылося і ўкамплектаваньне школы вучнямі; усяго ў школе будзе навучацца 274 вучні. Выходзячы з гэтай колькасьці вучняў, школа паставіла рубам пытаньне аб памяшканьнях. Сельсавет адпусьціў пад школу былы папоўскі дом, які адрамантаваны пад кватэру настаўніка і інтэрнат. Старое памяшканьне школы пераабсталявана: замест 2-х класаў зроблена 4 і 2 кватэры для настаўнікаў. Пабелка, перацірка ўнутраных сьцен скончана яшчэ 25 ліпеня.

Кепска толькі тое, што райкамгас не дае школа для зашклення вокан, а іх шмат пабітых. У сувязі з адкрыцьцём 5 групы не хапае 20 школьных лавак, 2-х сталоў і 1 дошкі. Падручнікі і пісьмовыя прылады заказаны яшчэ ў чэрвені месяцы кнігарні БДВ, але дагэтуль заказ ня выкананы.

Школа зусім ня мае паліва, сельсавет-жа кожны дзень абяцае прыступіць да вывазкі дроў.

У бліжэйшыя-ж дні ўсе недахопы на фронце падрыхтоўкі да новага навучальнага году павінны быць зьнішчаны.

Я. С.

кова-дасьледчых дасягненьняў інстытуту ў гаспадарчыя ўмовы саўгасаў і калгасаў праз друк і шляхам непасрэднага выезду на месцы. У трэцюю бальшавіцкую вясну сэктарам было арганізавана 5 брыгад імя Усесаюзнай акадэміі с-г. навук імя Леніна ў складзе 20 чалавек, якія аказалі непасрэдную дапамогу саўгасам і калгасам у складаньні вытворчых плянаў і ўжываньня правілаў агратэхнікі. Апроч гэтага сэктар тэхпрапаганды разгарнуў вялікую работу па арганізацыі агратэхнічных гурткоў ня толькі ў сваіх апорных пунктах (інстытуту), дзе яны ўжо арганізаваны, але і ў цэлым радзе іншых саўгасаў і калгасаў. У 1932 годзе такія гурткі будуць арганізаваны ў 70 саўгасах і 120 калгасах. У канцы ліпеня сэктар склікае зьлёт тэхпропаў заняльных станцый УсеНДБІ для абмену вопытам сваёй работы.

Апроч гэтага ў 1932 годзе інстытутам праведзены курсы дзесятнікаў лугаводаў (2-хмесячныя), праз якія прапушчана 42 асобы, 3-хмесячныя курсы хронамэтражыстаў—17 асоб, курсы памочнікаў тэхнікаў па вопытнай рабоце для павышэньня кваліфікацыі—35 чалавек. Інстытут свае даклады ставіў на 12 зьлётах і канфэрэнцыях, дзе прымала ўдзел 37 навуковых работнікаў УсеНДБІ.

У арыентыровачным пляне 2-ой пяцігодкі УсеНДБІ прадугледжвае значную праграму, якая дасьць магчымасьць асваеньня вялізарнай колькасьці балотных масываў і выпрабаваньня новых культур на балотах. Усю сваю вытворчую работу інстытут праводзіць апрача апорных пунктаў, на базе Менскай балотнай станцыі. Менская балотная станцыя мае сваю гісторыю з 1914 году, але сапраўдную навукова-дасьледчую работу яна разгарнула толькі з вызваленьнем БССР ад беларускай. З 1923 году станцыя заняла ся праблемай асваеньня балотных зямель, якія займаюць вялізарныя плошчы ў зямельным балянсе БССР. У 1928 годзе, дзякуючы нясупынай энэргічнай працы работнікаў станцыі, было арганізавана больш тысячы мэліяратыўных таварыстваў—ядраў будучых калгасаў. Карысна работа станцыі на былым Камароўскім балоце прыцягнула да сябе ўвагу шматлікіх экскурсій: да 5.000 сялян—экскурсантаў перабыла на станцыі.

У сучасны момант з дапамогаю работнікаў станцыі на тэрыторыі БССР нанова арганізуецца пяць буйных каналёвых саўгасаў. У 1931 годзе станцыяй у парадку вытворчых вопытаў прапрацавані цэлы рад тэм (хімізацыя, тэхніка пасеваў і догляд за канопляміі, работа па тэхніцы і догляд за лёнам, па культуры тытуну і махоркі і г. д.). Рад гэтых вопытаў даў бліскучыя вытворчыя вынікі: з 1 га каналель сабрана да 12 цнт. вылакна (доўгага і кароткага) супроць 3-4 цнт. па норме. Станцыя таксама дамаглася значнага палепшаньня якасьці махоркі і павышэньня ўраджайнасьці тытуноў з 30 цнт. (сярэдняя на Украіне) да 70 цнт. з га. У сучасным годзе Менская балотная станцыя працягвае вытворчыя вопытныя работы па махорцы, тытунох, канопліі, а таксама работы з масьлічнымі культурамі, як гарчыца, рапс, сурэпка і г. д. У тэматыцы яраізацыі асноўных культур (кукурузы, шпаніцы, соргачніку і г. д.).

За свае работы і цесную сувязь з сацыялістычнай сельска - гаспадарчай вытворчасьцю станцыя ў 1928 г. па прадстаўленьні Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР узнагароджана ордэнам Чырвонага працоўнага сьцягу.

Ня гледзячы на малакольканасьць навуковых работнікаў (8 чалавек), Менская балотная станцыя цесна зьвязана з 12-цю саўгасамі і калгасамі. Свае дасягненьні (з іх досыць многа) перадае непасрэдна ў вытворчасьць. Сваімі дасягненьнямі станцыя абавязана чакаму і правільнаму ленінскаму кіраўніцтву партячэйкі інстытуту і штодзённай зацікаўленасьці ў рабоце спэцыялісту, галоўным чынам вучонага спэцыяліста тав. Шыперка і батаніка Адамавіча.

Гэтай-жа акалічнасьці абавязаны інстытут, даклады якога сыстэматычна заслухоўваюцца і абгаварваюцца як на бюро партячэйкі, так і на агульных сходах членаў партыі. Актыўны ўдзел навуковых работнікаў інстытуту і станцыі, галоўным чынам тав. Шушкевіча і Кагана, ствараюць усе прадпасылкі для далейшага разгортваньня навукова дасьледчай работы станцыі.

Аднак у рабоце інстытуту і станцыі маецца і недахоп, адсутнасьць БРВ. Намэнальна БРВ існуе, але фактычна ён не разгарнуў ніякай работы Гэты недахоп інстытут і станцыя павінны ў бліжэйшы час зьнішчыць, тым самым яны змогуць падпраддаваць рацыяналізатарскую і вынаходніцкую думку як работнікаў інстытуту і станцыі, так і рабочых саўгасаў і калгасьнікаў навукова-дасьледчым заданьням у НДБІ.

Ня дрэнныя паказьнікі работы дае Навукова-дасьледчы інстытут сьвінагадоўлі. Ня гледзячы на тое, што інстытут арганізаваны толькі ў 1931 г. як філіял усесаюзнага інстытуту сьвінагадоўлі (Палтаўскага), ён змог даволі шырока разгарнуць масавую работу па агратэхніцы, зоатэхніцы і тэхпрапагандзе. Інстытут сьвінагадоўлі апрача Беларусі абслугоўвае таксама Ленінградзкую і Заходнюю вобласьці. Аднак трэба сказаць, што Беларусія інстытутам значна лепш абслугоўваецца, чым астатнія воны яго дзейнасьці. Усё-ж інстытут мае непасрэдную сувязь са сваімі апорнымі пунктамі ня толькі ў Беларусі. У час веснавой пасеўнай кампаніі 1932 г. інстытутам былі вылучаны брыгады для непасрэднай практычнай дапамогі калгасам і саўгасам. Работнікі інстытуту месяцамі знаходзіліся непасрэдна на палёх саўгасаў і калгасаў.

У 1931 г. розныя сэктары інстытуту прапрацавалі цэлы рад праблем па кармовых пытаньнях і па палепшаньні пароды жывёлы. Значную работу правёў сэктар тэхпрапаганды, якім кіруе тав. Змушко. Апошні мабілізаваў усе навуковыя рэсурсы інстытуту, праз рэпубліканскі і раённы друк даў рад канкрэтных артыкулаў у галіне агра-і зоатэхнікі. Гэтыя артыкулы напісаны жывой і папулярнай мовай, зразумелыя радавому рабочаму саўгасу і калгасьніку, давалі рэальныя паказаньні, як утрымаць стада, як правільна карміць і г. д.

Апрача гэтага сэктар тэхпрапаганды праз рэспубліканскую газэту «Сельска-гаспадарчы рабочы Беларусі» праводзіць завочныя курсы сьвінароў, дзе шляхам лекцый і гутарак дае вытворчую вучобу.

Ёсьць пры інстытуце і БРВ у складзе 7 чалавек, які аднак яшчэ належным чынам не разгарнуў сваёй работы. Між тым у інстытуце і

ПАЗЫКУ „4-ГА ЗАВЯРШАЮЧАГА“—У МАСЫ

Пераключыць усе сілы, усю энэргію гораду на аказаньне сацыялістычнай дапамогі вёсцы

ЦК КП(б)Б—ГІКАЛО, СНК—Галадзеду, Наркамфін—Хацкевічу, Белтрактарацэнтру і рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“

Заслаўе. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, у выніку шырокай масавай работы, актыўнага ўдзелу рабочых МТС, калгасьнікаў, беднякоў і серадняко-аднаасобнікаў—гадовы плян рэалізацыі акцый трактарацэнтру па Заслаўскім раёне на 10-е жніўня выкананы на 103 проц.

Рэалізацыя акцый працягваецца пад лёзунгам барацьбы за другую МТС у раёне.

РК КП(б)Б—РУДЗІНСКІ
РВК—ГАЎКАЎ
РАЙФа—БЭРМАН
МТС—ДУКАЧ

Работніцы падпісваюцца і выклікаюць

На агульным сходзе работніцы сьвінафэрмы саўгасу Гаўрыленка, Кастюковіцкага раёну, пасьля інфармацыі т. Церахава аб значэньні новай пазыкі «4-га заключнага» поўнасьцю падпісаліся на месяч ны аклад і выклікалі на сацспаборніцтво пляводчыя брыгады.

На гэтым самым сходзе адбылося прэм'яваньне лепшых ударніц-сьвінарак.

Сантук Н., старшая работніца-сьвінарка прэм'явана грашыма—30 проц. асноўнага месячнага заработку, Крывалава К., Адчалка, Прыналава прэміраваны плацьцем, Лебедзева—шарсьцяною хусткаю.

Лонька. Значкоўскі.

Падпіску спынілі

Мінулі тэрміны рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага», але Магілеўскі раён усё яшчэ ня мае адпаведных вынікаў. Апошняя дэкада ліпеня далапавышэньне па рэалізацыі пазыкі толькі на два процанты. Асабліва дрэнна праходзіць падпіска на вёсцы. Заданьне па калгасным сэктары выкананa на 30 проц. Сярод аднаасобнікаў рэалізавана толькі 610 руб.

З боку фінансавых органаў адсутнічае арганізацыйна-масавая работа вакол пазыкі «4-га завяршаючага».

Ашчадкаса не ўзначаліла апэрацыйнага кіраўніцтва ходам рэалізацыі 1 афармленьня пазыкі. У апошні час на глядаецца, што рад сельсаветаў і калгасаў зусім спынілі работу па прадпісаньні павінных атрымаць рашучы адпор ад грамадзкасьці раёну. Райфа павінна ўзначаліць апэрацыйнае кіраўніцтва ходам рэалізацыі пазыкі.

Трэба шляхам сацспаборніцтва арганізаваць падпіску сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў і скончыць яе ў бліжэйшыя дні.

Вольны

ВЯСКОВЫ СЭКТАР АДСТАЕ

ПЕТРЫКАЎ. Петрыкаўскі раён па групе рабочых і служачых заданьне па рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага» выканаў на 120 проц. Ганебнае адставаньне ў рэалізацыі пазыкі мае месца па вясковым сэктары. Заданьне па калгасах выканана на 39,5 проц., па аднаасобным сэктары—на 0,9 проц.

Ганебнае адставаньне па вясковым сэктары тлумачыцца, бязьдзейнасьцю большасьці партыйных і камсамольскіх ячэек і сельсаветаў, адсутнасьцю масава-растлумачальнай работы. Афармленьне і ўнясэньне чарговых узносаў па падпісцы праходзіць самацёкам.

З боку апарату Райашчадкасы адсутнічае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам рэалізацыі пазыкі, апрача інспектара Райашчадкасы тав. Шадуйзыка, які запраўды змагаецца за рэалізацыю пазыкі.

Камсамол Петрыкаўшчыны, уключыўшыся ў дэкадзік за выкананьне фінпляну III кварталу і рэалізацыю пазыкі, выклікаў на сацспаборніцтва Мазырскую арганізацыю камсамолу.

Райашчадкаса павінна ўключыцца ў камсамольскі дэкадзік і забясьпечыць выкананьне пляну па рэалізацыі пазыкі па-вясковым сэктары ў бліжэйшыя дні.

А. Пялінскі.

Адкладаюць... „да заўтра“

Падпіска на «4-ты завяршаючы» па Ушачанскім раёне выканана на 56 проц. Сельспажыўтаварыства яшчэ да гэтага часу не правяло падпіскі сярод сваіх членаў, а праўленьне што дзённа ўсё адкладвае «да заўтра». Ня лепш абстаіць справа па калгасах. Падпіскай ахоплены ня ўсе калгасы, а там, дзе і ахоплены, дык зусім дрэнна справа абстаіць з афармленьнем пазыкі.

Абраныя камісіі садзейнічаньня зрываюць падпіску. Камсод калгасу «Чырвонае сяло»—Масьлюк П., Шпак Марка і Судак Мікіта самі не падпісаліся на пазыку і не праводзяць ніякай работы сярод аднаасобнікаў. Зрыўшчыкі падпіскі павінны атрымаць рашучы адпор ад грамадзкасьці раёну. Райфа павінна ўзначаліць апэрацыйнае кіраўніцтва ходам рэалізацыі пазыкі.

Трэба шляхам сацспаборніцтва арганізаваць падпіску сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў і скончыць яе ў бліжэйшыя дні.

Вольны

Падпіска на вёсцы праходзіць марудна

НАРОЎЛЯ. Падпіска на пазыку «4-га завяршаючага году пяцігодкі» па групе рабочых і служачых у раёне 26 ліпеня складае 110 проц. Сярод калгасьнікаў плян падпіскі выканан усяго на 32 проц. У аднаасобным сэктары з 136 тысяч руб. рэалізавана ўсяго 292 руб.

Адставаньне ў падпісцы калгасаў і аднаасобнікаў тлумачыцца апартуністычнымі адносінамі парт'ячэек, сельсаветаў і праўленьняў калгасаў да пазыковай кампаніі. Адсутнічае канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва падпіскай з боку райфа, якое не мабілізавала ўдарнікаў фінансавата фронту. Скліканыя на 24 ліпеня куставыя нарады фінактыву ў большасьці оваёй не адбыліся. Райашкадкаса, на чале са старшынёй Браневічам, не забясьпечыла выкананьня тых задач, якія стаяць перад ёю ў справе рэалізацыі пазыкі і мабілізацыі сродкаў наогул.

Такое адставаньне ў далейшым недапушчальна. На ліквідацыю прарыву па рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага году» ў вёсцы неабходна кінуць сілы партыйнага і прафэсіянальнага актыву раёну.

Белта.

ЧАКАЮЦЬ ДЫРЭКТЫЎ...

(На нарадзе пры РК КП(б)Б)

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Больш таварау шырокага спажываньня, каб задаволіць патрабаваньні рабочых, калгасьнікаў і працоўнае сялянства—першачарговая палітычна-гаспадарчая задача дню.

Калгасы, калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі едуць на базары ня толькі для таго, каб прадаваць сваю сельскагаспадарчую прадукцыю, але і натуральна для таго, каб там-жа купляць па трэбную мануфактуру, абутак і прадметы хатняга ўжытку.

Таму мы абавязаны насустрач разгортваньню калгаснага гандлю накіраваць шырокія патокі тавараў шырокага спажываньня, але...

У Жлобіне гэтага не зразумелі

На апошняй нарадзе пры РК КП(б)Б усіх прамысловых арцеляй, гаспадарнікаў і кааператараў высьветлена, што вырабам шырспажыву ніхто ня хоча займацца.

Так, мэханізаваная арцель кавалёў для арганізацыі вырабу прадметаў шырспажыву нічога не зрабіла, нават пастанова ЦВК і СНК ня была прапрацавана на сходзе членаў арцелі. Арцель мае ўсе магчымасьці, каб наладзіць выраб шырспажыву, але праўленьне не разумее ўсёй вялізарнай важнасьці гэтай задачы і нічога не зрабіла ў гэтым напрамку. «Мы будзем рабіць толькі па заказах кааперацыі, заказаў ад сялян ня прымаем. У нас малая колькасьць рабочых»,—заўважае кіраўнік арцелі т. Шандалаў.

„У нас няма дырэктывы райпрамсаюзу“

Кіраўнікі кравецкіх арцеляй Жлобіну і Пірэвіч на запытаньне — чаму яны не займаюцца вырабам шырспажыву, адказалі: «Пра пастанову ліпеньскага пленуму ведаем, але без дырэктывы райпрамсаюзу нічога ня маем права рабіць» (?!). І запраўды, Жлобінская арцель ужо падрыхтавала сваю краму да гандлю, але толькі чакае гэтай «дырэктывы», каб прыступіць да выкананьня пастановы партыі і ўраду, бо Пірэвіцкая арцель «папрабавала па-за плянава набыць у Гомелі каўняроў, дык за гэта ўлящела ад райпрамсаюзу».

Нават заслончыкаў у рамонт ня прымаюць

Сталярная арцель невялікая, з 10 чалавек. Пэрспэктывы на пашырэньне і рост арцелі—вялікія, але ніякіх заказаў апрача як ад арганізацый арцель не прымае. Калі нават трэба ручку да старога заслончыка прыробіць, дык і гэтага ў Жлобіне ня зробіш. Шмат магчымасьцей для вырабу розных рэчаў, але... «зрабіць нічога ня можам».

Таксама нічога яшчэ ня зроблена і шавецкай арцельлю. Толькі адна інвалідная кравецкая арцель практычна прыступіла да ажыцьцяўленьня гэтай задачы. Арцель ужо запусціла па-за плянава матар'ялу на 4.000 руб. і адкрыла сваю краму.

Не таптацца на месцы

Ня менш адказная роля ў справе вырабу прадметаў шырспажыву ўскладзена на мясцовую прамысловасьць. Але і тут мы яшчэ ня маем запраўды бальшавіцкіх тэмпаў у вырашэньні гэтай задачы.

Толькі чыгуначнікі дэпо, правёўшы разгорнутую масава-растлумачальную работу вакол апошніх пастаноў партыі і ўраду, прыступілі да практычнай работы. З-га жніўня арганізаваны ўтыльцэх, у якім працуе 2 кавалі і адзін бляхар. Водкіды жалеза, сталі і бляхі будуць выкарыстаны для вырабу тапароў, нажоў, кружак, відэльцаў і інш. прадметаў.

Гаспадарнікі не сьпяшаюцца

Вучком ЧСУ—6 правёў даволі значную работу па растлумачэньні пастаноў партыі і ўраду сярод рабочых вучастку і праправаў практычна гэтае пытаньне на тэхнічнай нарадзе. Праведзены спэцыяльныя суботнікі па зборы водкідаў. Вызначана праграма па вырабе шырспажыву: зубы для боранаў, лаўкі, табурэткі, шафачкі, тазы, самаварныя трубы, вілкі, трыножкі, завесы, кручкі, клямкі, стаместкі. Але водкіды паступаюць, суботнікі праводзяцца, а гаспадарнікі яшчэ і ня думаюць прыступаць да арганізацыі майстэрняў і брыгад для вырабу шырспажыву.

У выніку—узьнятая актыўнасьць рабочых разьбіваецца цьвёрдалобасьцю кіраўнікоў, якія яшчэ не зразумелі ўсёй вялізарнай палітычнай важнасьці ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб разгортваньні вырабу прадметаў шырспажыву.

Леспрамгас чакаў нарады

Кіраўніцтва леспрамгасам толькі на нарадзе пры райкоме партыі здолела заявіць, што яно ўжо сёньня можа рэалізаваць 300 пар аглабель, вагон бярозавых дручкоў, 6.000 шт. садовых калоў, 50 куб. мэтр. лесаматар'ялу, 26 куб. мэтр стоек для агарожы, 2.500 шт. жэрдак і вагон тынкавальнай лучыны.

Узьняць масы на выкананьне дырэктывы партыі

Зусім зразумела, што такое становішча з выкананьнем важнейшай дырэктывы партыі і ўраду надалей нецярпімма. Апартуністычная недаацэнка справы разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня павінна атрымаць руйнуючы адпор.

Насустрач патокам сельска-гаспадарчых прадуктаў накіручы магутныя патокі прамтавараў і шырспажыву.

Закрэўскі.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Гіндэнбург за стварэньне „беспартыйнага“ ўраду

БЭРЛІН, 11-8. Вячэрні друк публікуе афіцыйнае паведамленьне, згодна з якім «рэйхспрэзыдэнт зараз, як і раней, прытрымліваецца таго пункту гледжаньня, выходзячы з якога быў створаны сучасны ўрад, а іменна, што агульнагерманскі ўрад павінен быць незалежны ад партыі і парляманту».

Правы друк разглядае гэту пазицыю прэзыдэнта як процівагу спробам вырашыць пытаньне аб урадзе парляманцкім шляхам, чаго дамагаюцца фракцыі прускага лянд'тагу, асабліва фракцыя партыі цэнтру.

Супольная нарада фракцыі партыі цэнтру з нацыянал-сацыялістамі і германскімі нацыяналістамі павінна адбыцца 13-га жніўня, г. зн. назаўтра пасьля мяркуемых перагавораў паміж Гітлерам і Гіндэнбургам.

Адначасова старшыня прускага лянд'тагу, нацыянал-сацыяліст Керль, у адказ на патрабаваньне камуністычнай і сацыял-дэмакратычнай фракцыі аб хутчэйшым скліканьні лянд'тагу адказаў, што ён мяркуе склікаць лянд'таг яшчэ да адкрыцьця рэйхстагу.

Нацыянал-сацыялісты па-ранейшаму ўльтыматыўна патрабуюць назначэньня Гітлера рэйхсканцлерам. У бэрлінскім органе нацыянал-сацыялістычнай партыі «Атрыф», як і ў афіцыйнай заяве Гітлера, адхіляецца сьцьвярджаньні некаторых учарашніх бэрлінскіх газэт аб тым, што назначэньне Гітлера амаль вырашана ў станоўчым сэнсе і зазначаецца, што пытаньне вырашыцца ў бліжэйшыя дні.

Надзвычайны дэкрэт аб палітычных забойствах

БЭРЛІН, 11-VIII. Агенства Вольф паведамляе што, выданы прэзыдэнтам дэкрэт прадугледжвае кару сьмерцю за найбольш сур'ёзныя выпадкі палітычных гвалтоўных дзеяньняў, у асаблівасьці за забойства (хоць бы і не прадугледжанае) палітычных праціўнікаў, паліцэйскіх чыноўнікаў і вайсковых асоб. Іншыя гвалтоўныя дзеяньні каруюцца катаржнай турмой. Надзвычайныя суды ўводзяцца ў тых раёнах, дзе гэта будзе неабходна.

Другім дэкрэтам прадоўжаны палітычны грамадзянскі спакой да 31 жніўня.

***

БЭРЛІН, 11-VIII. Надзвычайныя суды, прадугледжаныя новым надзвычайным дэкрэтам, уведзены ў наступных правінцыях: у Рэйнскай усходняй Прусіі, Шлезвіг Гальштэйн, Сылезіі, Хамке, Аксельдорфе, Вэстфаліі, у Рэйнска-Вэстфальскай прамысловай вобласьці, Кенігсбэргскай, Эльзьбінскай і Брэслаўльскай судовых акругах.

Паліцэйская аблава і арышты камуністаў

БЭРЛІН, 11-VIII. 9 жніўня ў партовым пралетарскім квартале Гамбургу была зроблена паліцэйская аблава, у якой прымала ўдзел 1500 паліцэйскіх.

Усе падыходы да кварталу былі заняты паліцыяй. На стрэхах дамоў былі выстаўлены патрулі. Моцны паліцэйскі атрад заняў памяшканьне, якое наведвалі камуністычныя рабочыя. У дамох былі зроблены старанныя вобыскі, у часе якіх разбурвалі падлогу і сьцены. Канфіскавана вялікая колькасьць камуністычнай літаратуры і арыштавана 50 чалавек.

У Бэрліне зроблена паліцэйская аблава ў камуністычных клюбах. Арыштавана 24 чал.

Забастоўкі пратэсту, дэманстрацыі, галодныя паходы

БЭРЛІН. 12-VIII. У радзе прадпрыемстваў і на біржах працы ў розных гарадох Германіі адбыліся забастоўкі пратэсту і выступленьні супроць ураду. Рабочыя арганізавалі ў радзе гарадоў Германіі дэманстрацыі і выступленьні пратэсту.

У Эйзэнбэргу беспрацоўныя жанчыны з дзецьмі на руках дэманстравалі перад будынкам ратушы, патрабуючы хлеба і працы. У Бохуме перад біржай працы звыш 600 рабочых дэманстравалі супроць фашысцкага тэрору.

У Гальле будаўнічыя рабочыя правялі часовую забастоўку ў знак пратэсту супроць забойства фашыстамі кэнігсбэрскіх рабочых. У дзень пахаваньня забітага фашыстамі рабочага, рабочыя некалькіх прадпрыемстваў правялі палітычную забастоўку.

Абураныя апошнімі надзвычайнымі дэкрэтамі аб беспрацоўных, беспрацоўных (сярод іх многа жанчын і дзяцей), уварваліся на біржу працы, патрабуючы выдачы талёнаў на атрыманьне харчаваньня. Заместа гэтага была выклікана паліцыя, якая стала пазьверску разганяць беспрацоўных. Падобныя галодныя дэманстрацыі адбыліся і ў іншых рабочых цэнтрах Рурскай вобласьці.

Цялеснае пакараньне ў ПАЗШ. Мідэрсбурт.

Выкананьне сьмертнага прыгавору над засуджаным рабочым.

Гераічная забастоўка бэльгійскіх гарнякоў працягваецца

ПАРЫЖ. 12-8 У Шарлеруа, Монсе, Ваме (Бэльгія) забастоўка прыняла ўсеагульны характар. У Эзо на пікет бастуючых гарнякоў напалі штрэйкбрэхэры.

У многіх шахтах Шарлеруа адбываюцца вострыя сутычкі паміж бастуючымі і штрэйкбрэхэрамі. У Лімбурскім раёне ў некаторых шахтах першы раз забаставалі неарганізаваныя рабочыя. Паліцыя арыштавала 16 рэвалюцыйных рабочых. У Льежы выданы ордэр арышту 22 камуністаў, якія абвінавачваюцца ва ўдзеле ў змове. Губэрнатар правінцыі Эно выдаў загад, у якім забараняе вулічныя дэманстрацыі і дае права паліцыі разганяць мітынгі.

ЦК кампартыі Бельгіі апублікаваў адозву да бастуючых рабочых, заклікаючы іх да далейшай барацьбы.

Паўстаньне манархістаў пра валена

ЛЕНДАН. 12-8. Паводле зьвестак з Гішпаніі, манархічнае паўстаньне пад кіраўніцтвам генэрала Сан-Хурхо пацярпела няўдачу ў выніку ўсеагульнай забастоўкі рабочых.

Усеагульная забастоўка ў Сэвіліі

ПАРЫЖ. 11-8. Пад націскам манархічнага паўстаньня ў руху супроць ураду прынялі актыўны ўдзел шырокія масы працоўнага насельніцтва.

Прафэсыянальныя саюзы раёну Сэвіліі абвясьцілі ўсеагульную забастоўку пасьля таго, як манархісты пачалі паўстаньне. У Херэсе мелі месца масавыя выступленьні супроць грамадзянскай гвардыі (жандармэрыі), якая далучылася да манархічных змоўшчыкаў. Жандармэрыя была абязброена.

Паводле паведамленьня агенцтва Гавас, Санхурхо, пасьля часовага захопу ўлады ў Сэвіліі, апублікаваў сьпіс міністраў, у якім ён сам фігураваў у якасьці прэм'ера; генэрал Парэра—вайсковага міністра і генэрал Кавальканьці—начальніка грамадзянскай гвардыі.

У Саламанцы дэманстранты падпалілі кіёскі каталіцкіх часопісаў. У выніку сутычкі адзін забіты і шмат параненых. У Сэвіліі адбылася буйная рабочая дэманстрацыя. Дэманстранты вызвалілі палітычных вязьняў.

На фашыстоўскай сьцежцы

З боку с.-д. перашкод к руху няма

„ЛОДЗЬ—ГОРАД ЖАБРАКОЎ“

Орган буйных капіталістаў—лёдзінская газэта «Рэспубліка» ад 31-га ліпеня ў нумары 210 малюе наступнае становішча сучаснай Лёдзі:

«Лёдзь робіцца горадам жабракоў. Здавалася-б, што ўзімку, калі холад і голад найбольш адчуваюцца, колькасьць жабракоў павінна была-б узрастаць. За тое ўлетку, калі лягчэй можна знайсьці работу і харчаваньне на вёсцы, рады іх павінны былі-б значна зьменшыцца. Мы-ж, аднак, наглядаем зьявішча зусім адваротнае. Асабліва ў Лёдзі кідаецца ў вочы вялізарная колькасьць жабракоў».

«Лёдзь ёсьць горад вялікай галечы»—заканчвае газэта. Тысячы беспрацоўных перабіваюцца з дня на дзень. Людзі млеюць з голаду».

Два дні пазьней у варшаўскім «Нашым Пшэглёндзе» быў зьмешчаны артыкул пад загалоўкам: «Крык роспачлівай Лёдзі», які дапаўняе малюнак паданы «Рэспублікай».

«Доўгі час,—чытаем у «Нашым Пшэглёндзе»,—марылі лёдзяне, што крызіс ёсьць пераходнае становішча і што з прыходам веснавога сэзону або нават і восені, наступіць радыкальны паварот да лепшага. Сёньня-ж нават найбольшыя да гэтага часу аптымісты, бяз усякіх ілюзій згадзіліся з фактам, што крызіс працягваецца, будзе працягвацца нясупынна і што надыйшоў вельмі цяжкі і сумны час, канца якога ніхто бачыць ня можа.

Калі ідзеш па вуліцах Лёдзі, а асабліва па парках і сквэрах, дык кідаецца проста ў вочы вялікая колькасьць каладых мужчын, якія паходзяць з розных сфэр пачынаючы ад рабочых і канчаючы інтэлігентамі. Яны сядзяць на лаўках, або апатычна цягаюцца па адным ці групкамі. Гэтыя людзі, якія ў большасьці выпадкаў, ужо некалькі гадоў застаюцца бяз работы, выкінуты за борт жыцьця, перасталі верыць у існаваньне для сябе месца на сьвеце. З рукамі, памершымі яшчэ пры жыцьці і бясжыцьцёва вісячымі, сядзяць гэтыя беспрацоўныя, якіх зьнішчае голад і нявер'е ў сябе. Гэта—кандыдаты на самагубцаў.

Мы ўжо некалькі разоў зажачылі на факт трывожнага павялічэньня выпадкаў самагубстваў, якіх часта бывае па некалькі ў дзень і якія ня робяць ніякага ўражаньня.

Прагнаць голад—справа напаўненьня страўніка,—не зьяўляецца адзінай бядой няшчасных. У большасьці выпадкаў яны таксама ня маюць сабе і прыстанішча. Таму праводзяць яны па палове ночы па вакзалах Фабрычным і Калішскім пад выглядам чаканьня цягніка. «Выкрытыя» і ў выніку гэтага прачаныя адтуль, шукаюць яны прытулку ў цёмных брамах, або на лаўках у парках і на сквэрах. Лёдзь ужо перастала быць «сярдэцьцем гораду», яна зрабілася горадам смутным, занепакоеным і з тварам роспачы».

Тое, што пішуць газэты аб Лёдзі і шмат якіх іншых гарадох, адносіцца і да ўсёй Польшчы.

(«Трыбуна Радзецка»).

Зах. Беларусь і Зах. Украіна галадуюць

«Глос Народу», які выходзіць у Кракаве, піша:

«У некаторых ваколіцах Падкарпацьця ўжо даўно як распаўсюджваецца голад. Сяляне, якія жывуць у ваколіцах Туркі, ня маюць ужо нават бульбы і ніякіх іншых сродкаў да жыцьця і ходзяць «пасьвіцца» (як гэта самі называюць). Ядуць яны карэньні рознага зельля. Да ўсяго гэтага яшчэ сухмень, з прычыны якога няма зусім малака».

Гэта малюнак Польшчы. А вось кулацкі орган «Зялёны штандар» падае малюнак Заходняй Беларусі:

«Цэлыя прасторы зямлі не засеяны, а зімовыя пасевы куды горшыя, чым у мінулым годзе. 70 проц. сялян харчуюцца рознымі адкідамі, бо ўжо больш як два месяцы ў іх няма хлеба і бульбы».

У выніку такога становішча «зьявіўся вораг галодных і напаўголых сялян—тыфус, ад якога гіне шмат народу. З прычыны таго, што няма з чаго зрабіць труну, памёршых зашываюць у брудныя лахманы і нясуць на ўладзіных плячох на вечны адпачынак».

Так піша фашысцкі друк. Камэнтары не патрэбны.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Забастоўка Львоўскіх камунальнікаў зламана

ВАРШАВА. 11-8. Аб'яднаному фронту львоўскай улады і згоднікаў, пры дапамозе выключнага тэрору, удалося зламаць забастоўку львоўскіх камунальнікаў. Магістрат хоць і пайшоў часткова на ўступкі, аднак-жа не адмовіўся ад асноўнага патрабаваньня зьніжэньня зарплаты на 10 проц. Зьніжэньне зарплаты будзе праводзіцца бяз сумленьня, ва ўмовах бурнага супраціўленьня рабочых.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

14-га а 8 гадз. увечары агітмасаддзел ЦК КП(б)Б склікае нараду таварышоў, якія абсьледвалі калгасы па пытаньнях авансыраваньня, зьдзеў шчыны, барацьбы са стратамі і г. д.

Просьба зьявіцца акуратна.

АГІТ. МАС. АДДЗЕЛ ЦК КП(б)Б.

14-га а 5 гадз. увечары Агітмас. Аддзел ЦК КП(б)Б склікае нараду (з залі паседжаньняў ЦК) таварышоў, якія былі камандыраваны ЦК на рабёны па прасоўваньні тавараў шырспажыву на вёску.

Просьба зьявіцца акуратна.

АГІТ. МАС. АДДЗЕЛ ЦК КП(б)Б.

Парткалегія ЦКК КП(б)Бел. паведамляе, што 24-25 жніўня 1932 году ў г. Жыткавічах будзе працаваць Выязная ПТ ЦКК КП(б)Бел. па разглядзе наступных апэляцыйных спраў.

На 24-VIII-32 г. у Жыткавічах

1. Барбасаў Жыткавіцкі раён.
2. Жаголь Р. Жыткавіцкі раён.
3. Балдзенка І. Жыткавіцкі раён
4. Дурчын, Жыткавіцкі раён
5. Ярмалавіч В. Жыткавіцкі раён
6. Крокас Жыткавіцкі раён.
7. Бясьмертны А. Жыткавіцкі раён
8. Трахімаў С. Жыткавіцкі раён
9. Турэцкі С. Жыткавіцкі раён

На 25-VIII-32 г. у Жыткавічах.

1. Гінэльман Б. К., Тураўскі раён.
2. Мелешчанг С. Тураўскі раён.
3. Рудый Я. Тураўскі раён.
4. Ізьвекаў А. Тураўскі раён.
5. Балюк А. Тураўскі раён.
6. Нарыкевіч П. Тураўскі раён.
7. Радзіонаў М. Тураўскі раён.
8. Ярмаленка Р. Тураўскі раён.
9. Геллер М. Б. Тураўскі раён.

Член ПК ЦКК КП(б)Бел. БГЭ

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня
Гукавы мастацкі фільм Пуцёўка ў жыцьцё Штодзённа 4 сэансы. Пачат. 5-30, 7-15, 9 і 10-45 Каса ад 4 гадз.
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Каса ад 12 гадз.
Ад 6 жніўня амерыканская камэдыя ХРЫЗАНТЭМА Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно.

БАБРУЙСКІ ЛЕСАТЭХНІЧНЫ ТЭХНІКУМ
праводзіць
ЧАРГОВЫ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на першы курс дзённага—120 чал. і на першы курс вячэрняга тэхнікуму—120 чал.
На фанэрнае аддзяленьне 30 чал. (дзённы), 60 чал. (вячэрні).
На лесапільнае „ 30 чал. „ 30 чал. „
На сталярна-будаўнічае 60 чал. „ 30 чал. „
У тэхнікум прымаюцца скончыўшыя сямігодкі, вячэрнія школы павышанага тыпу і інш. школы з праграмамі сямігодак, альбо падрыхтоўч. курсы ў тэхнікумы.
Жадаючыя паступіць павінны падаць да 1 верасьня заяву на імя прыймовае камісіі тэхнікуму па адрасе: горад Бабруйск, Савецкая, 76, лесатэхнікум.
Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: 1. Анкета, засьведчаная прафарганізацыямі (для сялян сельсаветам). 2. Пасьведчаньне аб адукацыі (арыгінал). 3. Пасьведчаньне аб сацыяльным паходжаньні і маемасным становішчы ў сучасны момант (сялянам даведку ад сельсавету аб разьмеры сельска-гаспадарчага падатку), 4. Мэтрычную даведку, 5. Даведку ад урача аб стане здароўя, 6. Аб адносінах да вайсковай павіннасьці, 7. 2 фатакарткі, паштовых марак на 30 кап.
Правілы для паступленьня ў вячэрні тэхнікум тыя-ж, што і на дзённы, за выключэньнем таго, што навучаньне будзе праходзіць без адрыву ад вытворчасьці.
Заняткі пачнуцца 10 верасьня 1932 году.
65 проц. агульнага ліку студэнтаў забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у разьмеры ад 25 да 120 руб.
Дырэктар лесатэхнікуму ШТЫЦКО.

Жлобінская школа ФЗВ Птушкапрамысловасьці
абвяшчае
АСЕНЬНІ НАБОР ВУЧНЯЎ у ШКОЛУ
у ліку 60—70 асоб.
Прымаюцца: рабочыя і іх дзеці, калгасьнікі, служачыя, саматужнікі і сялянае-аднаасобнікі (бедняки і маламоцныя серадняки) ва ўзросьце ад 16 да 19 гох, маючыя адукацыю ў аб'ёме сямігодкі (група на базе сямігодкі) і 6-ці груп сямігодкі (група на базе 6-годкі).
Школа рыхтуе кваліфікаваных рабочых (брыгадзіраў, памтэхнікаў і рабочых вышэйшай кваліфікацыі) па птушкаводстве (зоатэхнічны ўхіл) і прамысловай пераапрацоўкі птушынай прадукцыі (тэхналёгічны ўхіл).
Усе залічаныя забясьпечваюцца зарстыпэндыяй ня ніжай 35 руб. у месяц з павышэньнем да 65 руб. у адпаведнасьці з пасьпяховасьцю і павышэньнем кваліфікацыі кожнага вучня ў паасобку і інтэрнатам або кватэрнымі.
Заявы з усімі неабходнымі дакумантамі, згодна правіл прыёму ў прафшколы і тэхнікумы прымаюцца да 20-га верасьня па адрасе: гор. Жлобін, птушкакамбінат, школа ФЗВ.
Пачатак заняткаў з новым наборам 1 кастрычніка 1932 г.
Заняткі з вучнямі старых набораў пачнуцца 25 жніўня г. г.
Загадчык ФЗВ ЖАКОВІЧ.

ВІЦЕБСКІ ВЭТКАМБІНАТ
праводзіць
ДАДАТКОВЫ НАБОР 60 АСОБ
з ведамі сямігодкі на падрыхтоўчыя курсы ў Віцебскі вэтэрынарны інстытут
Прыём заяў з дакумантамі:
аб адукацыі, узросьце, сацыяльным становішчы, здароўі—у канцылярыі курсаў,
Віцебск, Валадарскага, 58|15
Усе прыняты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Заявы прымаюцца з 15 жніўня да 15 кастрычніка 1932 г.
ВЭТКАМБІНАТ.

Беларускай канторы УСЕКАБАНКУ патрэбны на сталую работу ў Менску:
Ст. ІНСПЭКТАР
ІНСПЭКТАРЫ
БУХГАЛЬТАРЫ
САКРАТАР-МАШЫНІСТ(КА)
Зварочвацца: гор. Менск, будынак Белканторы Дзяржбанку (2-гі пав.).
КІРАЎНІЦТВА БАНКУ.

Яўрэйскі нарсуд г. Менску на падставе прысуду ад 4-XII-31 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне возчыку Сіменчыку Якаву Файвелеву за тое, што ён кідаўся біцца да гр-на Лыўкова, калі апошні зайшоў да яго сястры Гінзбург.

Яўрэйскі нарсуд г. Менску на падставе прысуду ад 4-XII-31 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне служачай 10-га ларка Белдзяржгандлю Гінзбург Рыве Файвелевай за тое, што яна ўзьвяла паклёп на гр-на Капілевіча, кажучы, што ён лез да яе ў кішэні красьці.

Народны суд Хойніцкага раёну, на падставе прыгавору свайго ад 19 студзеня 1932 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне был. старшыні Хойніцкага райкапсаюзу Карасю Васілю Майсееву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў, выявіўшыхся ў несвоячасовым прадстаўленьні зьвестак райснабу аб ходзе загатовак.

Народны суд Хойніцкага раёну, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне служачаму весаўчычыку на чыгуначнай ст. Хойнікі Фролаву Івану Андрэеву за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў, выявіўшыхся ў пагрузцы экспартнай крухмальнай мукі ў вагон з-пад вугалю.

Яўрэйскі нарсуд г. Менску на падставе прысуду ад 7-II-32 г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні жакту № 53 Вайнэру Давіду Майсееву за тое, што ён самавольна перасяліў гр-на Дульцына ў кватэру Лельчука, а Якабсона ў кватэру Дульцына.

Упаўнаваж. Галоўлітбелу № А-53.